ЯНА БУДАВАЛА МАНАСТЫРЫ... 7

ЗАГАДКІ МАСТАКА АЛЕГА ПРУСАВА 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 САКАВІКА 2021 г. СУБОТА № 43 (29412)

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

«Шмат што зроблена, у тым ліку ўладамі на мясцовым узроўні. Але ёсць сур'ёзнае пытанне — занятасць. Скарачэнне работнікаў на вытворчасцях недапушчальнае, але і казаць, што мы ўсе пытанні на макраўзроўні павінны вырашаць, гэта таксама няправільна. Дзяржава зрабіла ўсё, каб развіваць вытворчасць на месцах, створана заканадаўчая база, таму ў гэтым пытанні трэба мясцовым органам улады праяўляць актыўнасць».

Вясне насустрач

Дарагія суайчыннікі!

Ад усяго сэрца віншую вас з цудоўным вясновым святам — Днём жанчын.

Сімвалічна, што самыя галоўныя для кожнага чалавека словы — мама, сям'я, Радзіма — жаночага роду. Менавіта вы захоўваеце і перадаяце новым пакаленням найважнейшыя каштоўнасці і традыцыі. Пры гэтым вам падуладныя любыя прафесійныя, спартыўныя, творчыя вяршыні.

У гісторыі краіны і народа бывалі розныя перыяды, але беларускія жанчыны заўсёды вылучаліся выключнай мудрасцю і спакойнай упэўненасцю ў шчаслівай будучыні.

У гэты святочны дзень жадаю вам і вашым блізкім моцнага здароўя, кахання, узаемаразумення, мірнага неба над галавой і поспехаў ва ўсіх добрых пачынаннях.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАРАТКА

• Міністры абароны Беларусі і Расіі абмеркавалі сумесную сістэму супрацьпаветранай абароны.

• **Курсант Універсітэта грамадзянскай абароны МНС Кацярына Рудовіч стала лаўрэатам маладзёжнай прэміі «За справу».**

• Беларускае радыё ў Міжнародны жаночы дзень правядзе эфірны віншавальны марафон.

• **У Барысаве ордэнам Маці ўзнагародзілі 27 жыхарак Мінскай вобласці.**

З нагоды

«НА СВЯТА ЯШЧЭ НЕ РАЗВУЧЫЛІСЯ ДАРЫЦЬ КВЕТКІ»

Даведаліся, колькі каштуе букет на 8 Сакавіка

Восьмага сакавіка — не толькі Міжнародны жаночы дзень. Гэта яшчэ і дата, якую штогод чакаюць усе, хто заняты ў кветкавым бізнесе. Іх зорны час. Напярэдадні Жаночага дня мы вырашылі высветліць, колькі сёлета мужчынам прыйдзецца выдаткаваць на кветкі і ці прынята ў нас дарыць «мільён алых руж» каханай.



СТАР. 5

Размова па сутнасці

НАШЫ ЖАНЧЫНЫ — АШАЛАМЛЯЛЬНЫЯ!»

Часопіс «Алеся» як люстэрка жыцця беларусак

Які ён, партрэт сучаснай беларускай жанчыны? Што яе цікавіць? У чым крыніцы яе пазітыву і што надае сіл? Ці ёсць сёння час на чытанне і чаму яна аддае перавагу ў сучасным патоку інфармацыі? Гэтыя і іншыя тэмы першы намеснік галоўнага рэдактара «Звязды» Наталля КАРПЕНКА і журналіст Алена КРАВЕЦ абмеркавалі напярэдадні Міжнароднага жаночага дня з Ларысай РАКОЎСКАЙ, галоўным рэдактарам самага жаночага часопіса нашай краіны — «Алеся», якая з'яўляецца пераемніцай легендарнай савецкай «Работніцы і сялянкі».

СТАР. 8—9

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2021 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЗА ПЯЦІГОДКУ ЗАВОД ПАВІНЕН ГРЫМЕЦЬ НА ЎВЕСЬ СВЕТ»

Такую задачу-абяцанне агучыў кіраўнік дзяржавы ў гутарцы з калектывам ТАА «МотаВелаЗавод»

Рашэнне разгледзець перспектывы праблемнага прадпрыемства на месцы было прынята Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам на нарадзе ў Палацы Незалежнасці два тыдні таму. Пляцоўка завода абцяжарана пазыкамі, знаходзіцца пад кіраўніцтвам антыкрызіснага менеджара. Уласнае канструктарскае бюро заводу кампенсуюць два спецыялісты на аўтсорсінгу.

У 2016 годзе на заводзе ўвялі знешняе кіраўніцтва, генеральным дырэктарам стаў Мікалай Ладуцька. Варыянтам вырашэння сітуацыі з велізарнай пазыкай быў выхад у банкруцтва ААТ «Мотавела» і стварэнне новага прадпрыемства на яго тэрыторыі — ТАА «МотаВелаЗавод».

Выхад ёсць

У 2020 годзе на заводзе выраблена амаль 70 тысяч веласіпедаў і 3000 адзінак мотатэхнікі, асвоены выпуск электравелосіпедаў. Колькасць супрацоўнікаў павялічылася на працягу апошніх чатырох гадоў да 120 чалавек, вынікі гаспадарчай дзейнасці за мінулы год станоўчыя. Цікавасць для экспарту вела- і мотатэхнікі ўяўляе еўрапейскі рынак, ёмістасць якога штогод складае 30 мільёнаў адзінак. Але, як паведаміў пасля нарады ў кіраўніка краіны віцэ-прэм'ер Юрый Назараў, неабходна прыйсці на заходні рынак з якаснай прадукцыяй, а на існуючых пляцоўках і пры гэтых тэхналогіях стварыць сучасны прадукт ужо немагчыма.

Неабходна нешта вырашыць і з велізарнай пляцоўкай у цэнтры сталіцы. Сёння са 160 тысяч квадратных метраў плошчаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі ААТ «Мотавела», 70 тысяч — у нездавальняючым стане, далажыў Прэзідэнту мэр Мінска Уладзімір Кухараў. Аляксандр Лукашэнка, тым не менш, выказаўся супраць суцэльнага зносу старых будынкаў і прапанаваў правесці незалежную экспертызу, каб вызначыць, ці сапраўды іх немэтазгодна захаваць. Ён звярнуў увагу і на тое, што побач з гэтымі будынкамі растуць старыя прыгожыя дрэвы, якія таксама трэба імкнуцца зберагчы.

«Трэба па-гаспадарску падысці да гэтай тэрыторыі, 27 гектараў у цэнтры Мінска — гэта залатое дно! — адзначыў ён. — Тут павінна быць вытворчасць, і высокатэхналагічная вытворчасць».

Мяркуецца, што на гэтай тэрыторыі будзе створаны Мінскі тэхнапарк, які, у сваю чаргу, забяспечыць пэўнымі ўмовамі розныя бізнесы (пераважна вытворчыя; тыя, што будуць працаваць на «МотаВелаЗаводзе», будуць у прыярытэце). Дзевяць прамысловых арганізацый ужо гатовыя прыйсці сюды, паведаміў Уладзімір Кухараў (вытворцы прамысловых кранаў, гідраўлікі, харчовых дабавак, электронікі і іншага). Акрамя вытворцаў, плануецца размясціць на тэрыторыі і маркетынгавыя цэнтры, якія будуць займацца продажам вырабленай прадукцыі. Мінпрам прапануе стварыць тут адзіны маркетынгавы цэнтр усіх сваіх фірменных магазінаў, каб у адным месцы можна было паказаць усю беларускую прадукцыю.

«Трэба зрабіць узорны тэхнапарк, і на ўзор гэтага тэхнапарка развіваць іх у іншых гарадах і мясцінах, — пагадзіўся Прэзідэнт. — І гэта добрыя рабочыя месцы, не брудная вытворчасць».

Кіраўніку дзяржавы быў прапанаваны варыянт вырашэння праблемных пытанняў, звязаных з назапашанымі даўгавымі абавязацельствамі ААТ «Мотавела» і яго ліквідацыяй. Прэзідэнт у цэлым план ухваліў і даручыў падрыхтаваць адпаведны праект указа. Пры гэтым ён загадаў дзейнічаць аператыўна, не губляючы часу, каб пачаць рамонтныя, аднаўленчыя работы на тэрыторыі «Мотавела» пры наступленні спрыяльнага надвор'я.

Аляксандр Лукашэнка падрабязна азнаёміўся з тэрыторыяй, праінспектаваў стан спраў падчас паездкі па ёй на аўтобусе, даў указанні. Прэзідэнт таксама адзначыў, што неабходна ўказам прапісаць тыя ці іншыя льготы і вызначыць дакладныя ўмовы для тых, хто будзе ў далейшым працаваць на гэтай пляцоўцы.

«Так жыць нельга. І вы так больш жыць не будзеце»

Размову з калектывам ТАА «МотаВелаЗавод» кіраўнік дзяржавы распачаў з традыцыйнага абазначэння мэты свайго візіту. Ён паглядзеў на замерзлых жанчын, якія стаялі перад ім у цэху, што не ацяпляецца, і сказаў: «Так жыць нельга. І вы так больш жыць не будзеце». Прэзідэнт паведаміў, што даручыў кіраўніцтву завода і горада да зімы стварыць нармальныя ўмовы работы. Ацяпляць цэхі плануецца з дапамогай электрычнасці, паведаміў ён пазней.

«Што тут будзе зроблена? 27 гектараў тэрыторыя. Папярэдне (амаль канчаткова, бо прапрацоўка доўжыцца некалькі месяцаў) тут будзе створаны Мінскі тэхнапарк. Гэта арганізацыя, на пляцоўцы якой будзе асноўная вытворчасць — «МотаВелаЗавод», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. — Гэта мая асабістая і дзяржаўная справа».

Прэзідэнт заўважыў, што заўсёды ганарыўся беларускімі брэндамі: МТЗ, МАЗ, БелАЗ і «МотаВелаЗавод». «Мы спрабавалі шмат і прыйшлі да высновы, што ніякаму прыватніку мы не патрэбныя. Мала добрых прыватнікаў, якія гатовыя сёння працаваць для людзей (гэта маё перакананне, вы можаце інакш думаць). Таму было прынята рашэнне на дзяржаўным узроўні: аднавіць тую славу велазавода, якая была ў савецкі час», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт заўважыў, што заўсёды ганарыўся беларускімі брэндамі: МТЗ, МАЗ, БелАЗ і «МотаВелаЗавод». «Мы спрабавалі шмат і прыйшлі да высновы, што ніякаму прыватніку мы не патрэбныя. Мала добрых прыватнікаў, якія гатовыя сёння працаваць для людзей (гэта маё перакананне, вы можаце інакш думаць). Таму было прынята рашэнне на дзяржаўным узроўні: аднавіць тую славу велазавода, якая была ў савецкі час», — адзначыў беларускі лідар.

Вытворчасць «МотаВелаЗавода» будзе абноўленая на базе трэцяга корпуса — там з'явіцца «добрае, прыгожае, перадавое прадпрыемства», на якім за пяцігодку ўдвая павялічыцца выраб тэхнікі. «У цэнтры горада мы захаваем гэтую пляцоўку як вытворчую. Але чыстую. Тут не будзе ні ліцця, ні нафтапрадуктаў ніякіх», — адзначыў Прэзідэнт. Асаблівасць сталічнага тэхнапарка будзе заключацца ў тым, што тут будуць выключна вытворчасць і паслугі, якія з ёй звязаныя.

Дрэнныя часы для «МотаВелаЗавода» павінны скончыцца да восені-зімы бягучага года, паабяцаў кіраўнік дзяржавы і распарадзіўся запланаваць на гэты час візіт сюды.

За тры гады тэрыторыя «МотаВелаЗавода» павінна цалкам быць прыведзена ў ідэальны стан, акрэсліў наступны этап кіраўнік дзяржавы. «За тры гады будзе створана вельмі добрая вытворчасць. За пяцігодку завод павінен грымець на ўвесь свет, як некалі было ў савецкія часы», — рэзюмаваў ён.

«Гэта будзе, — не сумняваецца Аляксандр Лукашэнка. — У мяне ўжо быў такі вопыт на «Камволі»... Гэта немалыя грошы, будзем збіраць іх паціху, каб мы маглі нармальна працаваць».

Лепш, чым футбол і хакей

Супрацоўнікі «МотаВелаЗавода» спыталі Аляксандра Лукашэнку, як, на яго думку, можна развіваць веласіпедны рух у Беларусі. Кіраўнік краіны лічыць, што пачаць неабходна з «перабудоўвання розуму».

«Я з дзяцінства на роварах, і цяпер таксама... Не забываю пакруціць педалі. Асабліва калі растала лыжня, няма снегу, грязь. Па мокрым асфальце на лыжаролерах не прабяжыш, я бяру ровар ці іду на велатрэк. Вельмі шкадую, што я трэніруюся не на «Aist» і не на «Мінску», — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка.

Але ён запэўніў, што адзін веласіпед брэнда «Aist» у яго ёсць — атрымаў як падарунак. Не так даўно, падзяліўся кіраўнік краіны, яму прэзентавалі 30 самых сучасных карбонавых роварaў замежнай маркі. Адправіў іх юным спартсменам у секцыі.

«Мой ровар увесь свет бачыў, лічылі, колькі ён каштуе. Мне таксама яго падарылі гадоў пяць таму, але ён, зноў жа, не ваш. Зноў карбонавы. Я папрасіў, каб уважліва паглядзелі на вытворчасць карбонавых рам для роварaў. Спачатку збіраць будзем, а далей, можа, і стваралъ. Канкурэнцыя там вельмі вялікая», — заўважыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што веласіпедны спорт — самая карысная актыўнасць для здароўя, лепш, чым футбол і хакей. Ды і сетка веладарожак у сталіцы, па яго словах, дастатковая.

«Калі б у нас была сапраўдная дыктатура, я б забараніў па Мінску ездзіць на аўтамабілях. Толькі на роварах — гэта было б здорава. Таму я прыхільнік развіцця вытворчасці роварaў і веласіпеднага спорту, бо ён даступны ўсім», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны заявіў, што ўраду неабходна прапрацаваць праграму па ахове беларускага рынку роварaў. Гэтую задачу, паводле яго слоў, неабходна вырашыць за першае паўгоддзе.

Прэзідэнт заявіў, што асноўная задача вытворцаў — працаваць на якасць прадукцыі.

«Зрабіце якасны тавар. Мы вам дапаможам з гэтым, пабудаваўшы новы цэх. Новы цэх абыдзецца ў 30-40 мільёнаў долараў, там будзе і абсталяванне. Кажуць, што неабходна 5-7 мільёнаў долараў на абсталяванне — перадусім яго дапаможам купіць, каб вы на годным абсталяванні маглі рабіць роварa», — дадаў кіраўнік краіны.

Магчымасць працягнуць дынастыю

Прэзідэнт даручыў даць дзецям супрацоўнікаў «МотаВелаЗавода» магчымасць мэтавага накіравання ў ВНУ. Кіраўнік краіны мяркуе, што такім чынам удасца прыцягнуць на прадпрыемства маладыя перспектыўныя кадры.

«Каб развіваўся «МотаВелаЗавод», патрэбны адданыя кадры, спецыялісты. Вызначцеся і адпраўце мэтавым чынам іх дзяцей у беларускія ВНУ, найперш усім у Мінску. З такой умовай, што там яны атрымаюць адукацыю, а сюды вернуцца на работу», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

«У Лукашэнкі палацаў няма»

Прэзідэнт адказаў на чуткі пра свой палац. Ён сказаў, што апазіцыя выкарыстоўвае такія ўкіды, каб падбухторыць людзей да пратэсных выступленняў увесну.

«У Лукашэнкі палацаў няма, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы кантралюем сітуацыю, бачым. Яны беспілотнікі выкарыстоўваюць, падымаюць, фатаграфуюць. Дайшлі да таго, што прыватныя дамы, дзе дом большы, імкнуцца сфатаграфаваць і карцінку вывесіць. Як рэагаваць на гэта? Я запрашу незалежных гэтых журналістаў у гэты палац і ўсё пакажу».

Прэзідэнт запрасіў любога, хто знойдзе «палац Лукашэнкі», адразу засяляцца. «Адразу едзьце і засяляйцеся. Адразу кажу. Але абы ім разварушыць народ. А як разварушыць? Трэба нешта знайсці супраць улады, а перадусім неабходна знесці галаву, а галава — гэта Прэзідэнт. Вось і ўся іх палітыка», — мяркуе Аляксандр Лукашэнка.

Ён растлумачыў, які дом лічыць сваім палацам.

«У мяне ёсць палац — сем на восем домік, дзе я вырас з маці. Вось гэта мой палац, — сказаў кіраўнік краіны. — Прыязджайце, ён адкрыты для таго, каб чалавек змог прыйсці і паглядзець, дзе нарадзіўся Прэзідэнт. Усё астатняе належыць дзяржаве».

Усё робіцца для таго, каб зламаць краіну, упэўнены беларускі лідар.

«Украіна рухнула. Па перыметры ўсе постсавецкія рэспублікі разваліліся, а вось гэтая Беларусь яшчэ трымаецца, — сказаў ён. — Але яны ж цудоўна разумеюць, прабачце за нясціпласць маю, што трымаецца яна ў асноўным за кошт таго, што гэты Лукашэнка перашкаджае. Таму яго трэба звалiць. Калі б я вам яшчэ расказаў... Гэта яшчэ Камітэт дзяржбяспекі вам у найбліжэйшы час раскажа: колькі сюды тратылу завезлі. І нават пластыт. Хто спецыяліст, той ведае. Гэта не Аўтуховіча (падазраваны ў тэрарызме апазіцыянер. — **«Зв.»**) група. Гэта ўжо новыя. Добра, што іх прыкрылі. І там арсеналы. Навошта? Таму ім трэба зламаць, а нам трэба выстаяць. І мы гэта зробім».

Марыя ДАДАЛКА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Сустрэчы

У АТМАСФЕРЫ ДАВЕРУ І ДОБРАЗЫЧЛІВАСЦІ

Адбылася размова старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталлі КАЧАНАВАЙ з навучэнцамі Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў і Магілёўскага інстытута Міністэрства ўнутраных спраў.

Фота БелТА.

Нагода для сустрэчы — святкаванне ў краіне Дня міліцыі і 8 Сакавіка. Менавіта так, надыходзячы міжнароднага жаночага свята надала адметнасць і, так бы мовіць, шарм гэтай сустрэчы. І атрымалася, што падчас мерапрыемства ўрачыстая атмасфера гэтых свят панавала ў гістарычным будынку, дзе месціцца Савет Рэспублікі. Бо сюды былі запрошаны выключна дзяўчаты, якія навучаюцца ў вышэйназваных установах МУС.

І амаль адразу, дзякуючы здольнасці Наталлі Качанавай прыцягваць да сябе людзей і майстэрству выклікаць іх на шчырасць, размова страціла абрысы афіцыёзу і набыла таварыскі і зацікаўлены характар. Гутарылі аб розным. Старшыня Савета Рэспублікі лаканічна, але даходліва расказала аб рабоце сенатараў над законапраектамі, зменах у практыцы заканатворчай дзейнасці ў пастаянных камісіях верхняй палаты. Сёння іх члены імкнуцца ўжо на першым этапе работы над законапраектам падключацца да сваіх калег з Палаты прадстаўнікоў парламента. Нярэдка паміж парламентарыямі здараюцца дэбаты, спрэчкі і дыскусіі, але гэта толькі на карысць агульнай справе. Такі падыход спрыяе якаснай падрыхтоўцы новых законаў.

Зразумела, гаварылі і пра палітычную сітуацыю ў краіне. Наталля Качанава падкрэсліла: маладым людзям важна думаць аб тым, што менавіта яны ўжо зрабілі ці збіраюцца зрабіць для сваёй краіны, як мяркуюць служыць людзям, а не жыць выключна асабістымі інтарэсамі. Яна распытвала сурызмоўніц і пра вучобу, і пра тое, як яны авалодваюць прафесійнымі навыкамі і чым займаюцца ў вольны час, ці ёсць умовы для заняткаў спортам, як наладжана ў іх ВНУ фізічная падрыхтоўка. І была трохі здзіўлена, калі адна далікатная і сімпатычная дзяўчына прызналася, што займаецца самба.

Праз пэўны час дзяўчаты прыйдуць на службу ў органы ўнутраных спраў краіны. Вучоба — гэта адна справа, а канкрэтная работа — зусім іншае. Адсюль і пытанне з боку курсантак да спікера верхняй палаты парламента: як яна спраўляецца з псіхалагічнымі нагрузкамі, змагаецца з нападкамі ў яе бок. Ад Наталлі Качанавай прагучалі канкрэтныя парады, якія, думаецца, дапамогуць маладым выпускніцам акадэміі і інстытута выбіраць правільную лінію паводзін у крытычных сітуацыях.

У канцы сустрэчы Наталля Качанава пажадала гасцям горача любіць радзіму, а таксама плённай вучобы, поспехаў у далейшай праваахоўнай дзейнасці і самае галоўнае — заўсёды быць патрыётамі. У сваю чаргу курсанткі навучальных устаноў МУС выказалі словы шчырай падзякі Наталлі Качанавай за цікавую і вельмі карысную сустрэчу напярэдадні свята 8 Сакавіка, за кветкі і падарункі.

Леанід ТУГАРЫН.

Блізкая ўлада

ДЛЯ ВЫЯЎЛЕННЯ АКТУАЛЬНЫХ ПРАБЛЕМ

Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае на планавай аснове праводзіць выязныя прыёмы грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб.

Пры гэтым нараўне з правядзеннем названых выязных прыёмаў у стацыянарных умовах райгарвыканкамаў больш шырока будуць практыкавацца сустрэчы з працоўнымі калектывамі прадпрыемстваў і арганізацый розных формаў уласнасці, пасля завяршэння якіх адбудуцца мэтавыя асабістыя прыёмы работнікаў гэтых прадпрыемстваў.

Выязныя асабістыя прыёмы будуць праведзены на працягу сакавіка 2021 года. На наступным тыдні ў рэгіёнах такія сустрэчы ў мясцовых органах улады, а таксама з калектывамі прадпрыемстваў і асабісты прыём для іх работнікаў правядуць:

• памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Аляксеевіч МАРТЫНЮК — 10 сакавіка ў Слаўгарадскім раёне на ААТ «Слаўгарадскае лесанарыхтоўчае прадпрыемства»;

• намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Міхайлавіч КУНЦЭВІЧ — 11 сакавіка ў Бялыніцкім райвыканкаме;

• памочнік Прэзідэнта — інспектар па Брэсцкай вобласці Валерый Паўлавіч ВАКУЛЬЧЫК — 11 сакавіка ў Пінску на РУЭБП «Днепра-Бугскі водны шлях».

• памочнік Прэзідэнта па пытаннях развіцця фінансава-крэдытнай сістэмы Валерый Іванавіч БЕЛЬСКІ — 11 сакавіка ў Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце;

• памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый Хаджымуратавіч КАРАЕЎ — 12 сакавіка ў Іўі на ТАА «Тэхмаш».

Аты-баты

З ЭЛЕМЕНТАМ НЕЧАКАНАСЦІ

У 483-м асобным батальёне аховы і абслугоўвання, які дыслакуецца ў сталіцы, ёсць добрая традыцыя. Перад 8 Сакавіка віншаваць маці байца, які сябе добра зарэкамендаваў падчас службы, адпраўляецца ён сам разам са сваім камандзірам. Так адбылося і сёлета.

— Камандаванне батальёна вырашыла павіншаваць маці сяржанта Аляксея Бабаніна, — расказаў **камандзір узвода аховы роты аховы лейтэнант Эдуард МАРКАЎ.** — Ён у нас служыць год і тры месяцы. Купілі невялікі падарунак, кветкі, а таксама ўручылі падзячны ліст. Цікавінка нашага віншавання ў тым, што мы да апошняга трымаем яго ў сакрэце ад маці байца. Няхай гэта будзе для яе добрым сюрпрызам.

Намеснік камандзіра ўзвода, камандзір аддзялення роты аховы сяржант Аляксей Бабанін — віноўнік урачыстасці. Цікава, што ўсё жыццё ён пражыў у адным з дамоў, які знаходзіцца непадалёк ад часці. Не адзін дзясятак разоў хадзіў каля яе, а пасля прызыву аказаўся па той бок агароджы.

— Спачатку было крыху складана. Куды ні кінеш позірк — паўсюль знаёмыя месцы, а ты выйсці не можаш. Але пасля прывык.

І вось мы заходзім у адзін з пяціпавярховікаў. Маці хлопца, Юлія Вячаславаўна, адчыняе дзверы і... чуе падзяку на свой адрас ад імя камандавання часці.

— З нецярплівасцю чакаем, калі сын вернецца дадому, — кажа суразмоўніца. — І вельмі рады яго поспехам і дасягненням. Самае незвычайнае — гэта пісаць лісты сыну, які служыць літаральна за некалькі соцень метраў ад дому. Але што рабіць, такі лёс.

Аляксей Бабанін зусім хутка вернецца да маці. Звальненне ў запас ён чакае ў маі. Хлопец хоча вярнуцца працаваць па сваёй спецыяльнасці — пекарам. Але кажа, што думае перавучыцца на кухара...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Да свята

НАСТРОЙ ЦУДОЎНАЙ І ЛЁГКАЙ ВЯСНЫ

стварылі ў гандлёвым цэнтры «Сталіца»

Напярэдадні Міжнародага жаночага дня Беларускі саюз жанчын і канцэрн «Беллегпрам» правялі святочнае мерапрыемства «Настрой — Вясна», якое прайшло ў гандлёвым цэнтры «Сталіца». Жанчыны падчас свята адчувалі сябе сапраўднымі каралевамі: цырульнікі прапаноўвалі бясплатна зрабіць укладку, візажысты стваралі новыя і непаўторныя вобразы, а для аматараў рукадзелля быў прапанаваны майстар-клас па стварэнні модных экалагічных мяшочкаў. Тых жа, хто любіць літаратуру і шануе беларускую мову, чакаў стэнд Выдавецкага дома «Звязда». Там можна было атрымаць аўтографы папулярных пісьменнікаў Людмілы РУБЛЕЎСКАЙ і Леаніда ДРАНЬКО-МАЙСЮКА.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

— Каб стварыць жанчынам вясновы настрой і павіншаваць са святам, рыхтаваліся ўсе разам: і Мінгарвыканкам, і «Беллегпрам», і адміністрацыя гандлёвага цэнтра «Сталіца», — звяртаючыся да гасцей мерапрыемства, сказала **першы намеснік міністра аховы здароўя, старшыня Беларускага саюза жанчын Алена БОГДАН.** — Гэтае свята мы прысвячаем беларускім жанчынам. Мы ўсе вельмі розныя, жывём у розных месцах, у нас розныя звычкі і густы, адукацыя і ўзрост. Але ў гэты дзень мне хочацца шчыра пажадаць усім міру і спакою, дабрабыту, любові і ўзаемапавагі ў сем'ях. Няхай нашы мужчыны будуць здаровыя, а ў жанчын хапае сіл сумяшчаць работу і выхаванне дзяцей, няхай у нас хопіць сардэчнага цяпла, каб сагрэць, суцешыць тых, каму гэта сёння патрэбна. Са святам, сяброўкі!

У рамках творчай праграмы перад гасцямі цэнтра выступілі дзіцячыя і дарослыя творчыя калектывы, а таксама заслужаныя артысткі Рэспублікі Беларусь Алена Ланская і Ірына Дарафеева.

Упрыгажэннем культурнай праграмы мерапрыемства сталі модныя паказы вядучых беларускіх брэндаў «Камволь», «Цэнтр моды», «Світанак», «Калінка» і іншых. Таксама свае работы прадэманстравалі маладыя дызайнеры — прызёры рэспубліканскага конкурсу моды і фота «Млын моды».

— Вельмі сімвалічна, што мы знаходзімся ў гандлёвым цэнтры, які рэалізуе тавары лёгкай прамысловасці, і ўсе гэтыя тавары так ці інакш звязаныя з модай, — сказала ініцыятар мерапрыемства, **старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА.** — Эпідэмічная сітуацыя ўжо паляпшаецца. Нам хацелася павіншаваць нашых жанчын з новым вітком жыцця і стварыць ім вясновы настрой. Вясна для нас — пункт адліку, калі хочацца быць энергічнымі, тварыць. І няхай энергія гэтага свята дасць заряд усім жанчынам ствараць прыгожае, непаўторнае і важнае.

Арганічнай часткай свята стаў яркі стэнд Выдавецкага дома «Звязда», на якім можна было ўбачыць і газету «Звязда», і часопісы выдаецтва, а таксама кнігі, што ўбачылі свет у «Звяздзе». У якасці сюрпрызу для наведвальнікаў былі запрошаны ўжо згаданыя намі аўтары папулярных кніг — паэт Леанід Дранько-Майсюк, у якога ў «Звяздзе» нядаўна выйшаў зборнік паэзіі «Скарб», і пісьменніца Людміла Рублеўская, чыя новая кніга «Авантуры Вырвіча, Лёдніка і Чорнай Меланхоліі» — ужо шостая ў знакамітай авантурна-прыгодніцкай серыі.

Падчас аўтограф-сесій усе прысутныя маглі атрымаць дароўныя надпісы ад слынных літаратараў, задаць свае пытанні. Леанід Дранько-Майсюк павіншаваў з галоўнай пляцоўкі свята ўсіх жанчын, а ў якасці падарунка прапанаваў паэзію — самы рамантычны падарунак.

«У Вашым голасе
квітнеюць астры,
Якіх не бачыў я раней.
Мне зразумела ўсё і ўсё
няясна...
У Вашым голасе
квітнеюць астры,
І кожнай кветцы Бог сказаў:
Квітней...»

Падчас свята для наведвальнікаў была арганізавана дэгустацыя ад партнёраў праекта «Мінскі мясакамбінат», «Мінскхлебпрам» і іншых. Парадавала выстаўка беларускіх нацыянальных касцюмаў ад «Скарбніцы». А інфармацыйнае агенцтва БелТА прапанавала ацаніць унікальныя фота беларусак.

— Я вельмі ўражана святам, — падзялілася Таццяна, жыхарка Мінска. — Атмасфера склалася проста цудоўная, лёгкая, вясновая... Супрацоўнікі «Белпошты» павіншавалі мяне і прапанавалі адправіць бясплатна паштоўку з віншаваннямі дарагому чалавеку. Я напісала маці... Дзякуй за такую магчымасць!

Жанчынам валанцёры падарылі кветкі. Свята сапраўды стварыла ва ўдзельнікаў вясновы настрой.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ, Святлана ІВАНОВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі мяркуюць павышаць пенсійны ўзрост

Падчас рэалізацыі 14-га пяцігадовага плана сацыяльна-эканамічнага развіцця (2021—2025 гг.) пенсійны ўзрост у Кітаі будзе паступова павышацца, паведаміў прэм'ер Дзяржсавета КНР Лі Кэцян. Аб гэтым ён заявіў на сесіі Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў у Пекіне. Разам з тым прэм'ер адзначыў, што ўрад мае намер «працаваць над дасягненнем адэкватнага ўзроўню нараджальнасці», а таксама ўдасканаленнем сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Паводле ацэнак экспертаў, да 2035 года ў Кітаі два працуючыя будуць утрымліваць аднаго пенсіянера, а да 2050-га каля 35 працэнтаў насельніцтва краіны будуць складаць людзі пенсійнага ўзросту. Як вядома, цяпер мужчыны ў КНР маюць права выходзіць на пенсію пры дасягненні 60-гадовага ўзросту, жанчыны — 55-гадовага.

Еўракамісія прадставіла план скарачэння беспрацоўя

114 мільёнаў рабочых месцаў знікла летась ва ўсім свеце на фоне пандэміі і звязаных з ёй абмежавальных мер. Такія даныя апублікавала Сусветная канфедэрацыя працы, паведаміў Euronews. Адзначаецца, што беспрацоўе найбольш закранула жанчын і моладзь. Абвастрылася праблема і ў Еўрапейскім саюзе. «Пандэмія пахіснула шасцігадовую станоўчую тэндэнцыю, — адзначыў віцэ-старшыня Еўрапейскай камісіі Валдзіс Дамброўскіс. — Мы маем патрэбу ў кваліфікаваных рабочых месцах, асабліва для маладых людзей, таму што з-за крызісу беспрацоўе ў тры разы перавышае норму». Еўрапейская камісія апублікавала план павелічэння занятасці і скарачэння беднасці. Плануецца, што да 2030-га працаўладкаваны будуць 78 % насельніцтва ў параўнанні з 73 % у 2019-м. Доля беспрацоўнай моладзі павінна скараціцца да 9 працэнтаў. Колькасць тых, хто знаходзіцца на мяжы галечы і сацыяльнай маргіналізацыі, плануецца знізіць на 15 млн чалавек.

У САА3 дапусцілі перамогу над пандэміяй у пачатку 2022-га

Кіраўнік рэгіянальнага еўрапейскага бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САА3) Ханс Клюге мяркуе, што сусветную пандэмію каранавіруса ўдасца пераадолець да пачатку наступнага года. «Праз год мы будзем ведаць нашмат больш. Таму я выходжу з таго, што пандэмія пройдзе да пачатку 2022-га. Гэта не значыць, што віруса не будзе. Але, спадзяюся, што абмежавальныя дзеянні больш не спатрэбяцца», — сказаў ён у інтэрв'ю нямецкаму выданню Welt. На думку Клюге, летась пра захворванне яшчэ было вядома вельмі мала, сёлета пандэмія працягнецца. Эксперт лічыць, што жыхарам краін Еўропы пакуль рана расслабляцца, улічваючы, што вакцыны ўжо ёсць, але кампаніі па вакцынацыі пакуль ідуць павольна. Клюге адзначыў небяспеку распаўсюджвання «брытанскага» штама каранавіруса, які з'яўляецца больш заразным.

Апытанне з нагоды

Галоўная роля жанчыны — у чым яна сёння?

Гэтае пытанне «Звязда» напярэдадні свята задала, канешне ж, самім жанчынам — паспяховым, разумным, прыгожым.

Алена БОГДАН, першы намеснік міністра аховы здароўя, старшыня Беларускага саюза жанчын:

— Беларуская жанчына? Яна розная. У яе розныя прафесіі. Яна пячэ хлеб і лечыць людзей, праводзіць экскурсіі ў музеі і выкладае гісторыю ў школе, кіруе прадпрыемствам і выхоўвае дзяцей. Жанчыне падуладны ўсе прафесіі. Галоўнае, што яна з любоўю бярэцца за любую справу і робіць яе, укладваючы душу. Яна рознага ўзросту: юная, будучая мама, шматдзетная мама, бабуля і прабабуля. У яе розныя звычкі і густы. Яна любіць тэатр і сучасную музыку, жывапіс і раманы, чытае часопісы, газеты і гаджэты з кароткімі навінамі. Яна жыве ў мегаполісе-Мінску і на ўскраіне невялікай вёскі.

У чым роля жанчыны сёння? У любові, у стварэнні, у аб'яднанні добрых пачынанняў, у дапамозе іншым, у падтрымцы, у спагадзе.

Рознымі добрымі ўчынкамі жанчына робіць мноства вялікіх спраў на карысць нашай краіны. І няважна, гэта асабістая дапамога канкрэтнаму чалавеку або мерапрыемства маштабу краіны. Важна, што кожная з нас — «жанчына, якой ёсць пра што сказаць!».

Таццяна РУНЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах:

— Прыгадваючы словы Шэкспіра пра тое, што ўсё наша жыццё — тэатр, і ўсе мы ў ім акцёры, хочацца адзначыць, што жанчыны могуць сумяшчаць некалькі роляў адначасова: маці, жонкі, кіраўніка, педагога, трэнера ды мноства іншых.

Мы ўсё часцей бачым жанчын у сусветнай палітыцы і глабальнай эканоміцы. Многія з іх маюць поспех у розных сферах грамадскага жыцця, становяцца грамадскімі лідарамі, займаюць кіруючыя пазіцыі, арганізуюць і паспяхова вядуць свой уласны бізнес. У каштоўнасцях сучаснай жанчыны сталі пераважаць кар'ерны рост, матэрыяльная стабільнасць і незалежнасць.

Безумоўна, поспехі ў прафесійнай сферы і фінансавая незалежнасць важныя, але не яны робіць жанчыну пасапраўднаму шчаслівай.

Перш за ўсё жанчына — гэта клапатлівая мама і любячая жонка. Хто, як ні яна, здольная стварыць атмасферу любові, гармоніі і камфорту ў сям'і, клапаціцца пра дзяцей і іх выхаванне. Такая яе прырода. А сям'я — базавая каштоўнасць практычна ў любым грамадстве.

На мой погляд, у жыцці сучаснай жанчыны ўсё павінна быць гарманічна, па меншай меры, яна павінна імкнуцца да гэтага.

Я хачу пажадаць кожнай беларускай жанчыне адчуваць сябе шчаслівай не толькі напярэдадні прыгожага жаночага свята, а як мага часцей.

Ірына ДАЎГАЛА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве:

— У кожнай жанчыны — свае прыярытэты, бо мы ўсе розныя. Для кагосьці важна быць на вачах, быць яркай, выказваць грамадзянскую пазіцыю, рухацца наперад па кар'ернай лесвіцы. Камусьці па душы заставацца дома, расціць дзяцей. У трэцяй яшчэ адна пазіцыя: яна ўмее сумяшчаць прасоўванне па службе і хатнюю гаспадарку. Але гэта не гаворыць пра тое, што адна з іх лепшая за другую. Не, проста ў кожнай жанчыны свае прыярытэты ў жыцці, і гэта добра.

Дарэчы, у мяне дзень нараджэння 8 сакавіка, таму гэта свята асаблівае. Я часам, задаю сабе рытарычнае пытанне: чаму менавіта ў гэты дзень я нарадзілася?!

У звычайным жыцці я маці, жонка, бабуля. І рада, што мне ўдаецца сумяшчаць працу і сям'ю. Пэўны перыяд я адчувала, што не паспяваю ўдзяляць дастаткова ўвагі маім родным. Але самае прыемнае: яны не былі ў прэтэнзіі, а дапамагалі і падтрымлівалі.

Калісьці, 20 гадоў таму, мне пашчасціла быць за мяжой на міжнароднай канферэнцыі, якая была прысвечана гендарнай роўнасці. Там прасоўвалася ідэя раўнапраўя — то-бок 50/50 павінна быць мужчын і жанчын ва ўсіх парламентах свету. На канферэнцыі лавіла сябе на думцы: якія, насамрэч, мы розныя — мужчыны і жанчыны. У нас абсалютна адрозніваецца сістэма мыслення, погляды на перспектывы развіцця. Прабачце, калі я не маю рацыі, але я глыбока ўпэўнена: стратэгічнае мысленне — прыярытэт мужчын. Сёння, маючы багаты вопыт работы на дзяржаўнай службе, я магу сказаць гэта пэўна.

Але між тым жанчыны і ў нашай краіне, і ў іншых займаюць значныя пасады, годна выконваюць сваю работу, і многія мужчыны могуць павучыцца і пазайздросціць.

Як бы там ні было, якія б абавязкі мы ні выконвалі, якую б пасаду ні займалі, як бы ні рухаліся наперад па кар'ернай лесвіцы, мы ўсё роўна застаемся жанчынамі».

Таццяна ЛУГІНА, старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна «Беллегпрам»:

— На мой погляд, кім бы ні была жанчына — кіраўніком ці простай работніцай — самае галоўнае ў жыцці — сям'я і дзеці. Калі ў жанчыны ёсць вялікія амбіцыі і жаданне рабіць кар'еру, усё роўна яна не будзе цалкам шчаслівая без дзяцей, нават калі дасягнула вышынь у прафесіі. Такое маё асабістае меркаванне. А калі атрымалася стварыць сям'ю і спалучаць яе з любімай справай, — гэта шчасце для жанчыны. Хоць і вельмі складана ўсё паспяваць, асабліва калі заняты на рабоце з раніцы да позняга вечара. Засмажыць курыцу ці падаць на стол пірагі, зразумела, не атрымаецца так часта, як хацелася б. З іншага боку, прыгатаваць тую ж курыцу можа і муж ці дзеці — у нас цяпер раўнапраўе. Ды і хатніх памочнікаў у выглядзе пральнай і пасудамыечнай машыны сёння дастаткова. І калі ў сям'і ёсць узаемаразуменне, павага і клопат, такія дробязі, як непрыгатаваная вячэра, яе не разбураць.

Ірына ВАРАНОВІЧ, дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму:

— Для мяне жанчына — гэта ў першую чаргу жаноцкасць, пяшчота, спакой, а таксама ўменне бачыць і чуць, што адбываецца навокал. І жанчына паспяховая тады, калі ў яе ўсё атрымліваецца. Гэта цяжка, гэта вялікая праца над сабой, таму што шмат праблем і пытанняў сустракаецца на такім шляху. Але і многае залежыць ад жанчыны.

Я б сказала, што жанчына — гэта, найперш, асоба, і вельмі важна, наколькі яна змагла сябе зразумець. І для рэалізацыі трэба навучыцца сябе адчуваць. У кожнай жанчыны гэта адбываецца згодна з яе мэтамі і задачамі. Мабыць, сваю ролю адыгрывае і лёс, які вядзе нас па жыцці.

Для мяне галоўнае — гэта яднанне з самой сабой, калі ты чуеш і адчуваеш сябе, родных і блізкіх, людзей побач, прыроду, навакольны свет, менавіта ў такім глабальным сэнсе. Калі ты чуеш і адгукаешся, ты становішся шчаслівым, паўнавартасным чалавекам. Хоць не заўсёды ўсё атрымліваецца так, як хацелася б, праблемы ёсць і ў мужчын, і ў жанчын. Але самае галоўнае — захоўваць аптымізм і пазітыў, таму што так, як мы глядзім на свет, ён да нас паварочваецца. І ў любых абставінах трэба глядзець на свет аптымістычна, пазітыўна і не панікаваць.

Віншаванне

З Паўднёвага полюса Зямлі з любоўю...

Удзельнікі 13-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі павіншавалі сваіх каляжанак па Акадэміі навук і жанчын усёй краіны з цудоўным святам.

У пасланні, у прыватнасці, гаворыцца:

«Дарагія жанчыны — маці, жонкі, сёстры, дочкі, унучкі, калегі, уся прыгожая палавіна Беларусі! Мужчыны 13-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі цёпла віншуюць вас са святам — Днём жанчын — 8 сакавіка!

Вы дорыце нам любоў і радасць, акружаеце клопатам, вы натхняеце мужчын на подзвігі і здзяйсненні! Для вас мужчыны складаюць песні і вершы, вам прысвячаюць перамогі, дораць кветкі і падарункі!

Без вас наша жыццё было б чорна-белым сюжэтам.

Жадаем вам моцнага здароўя, мірнага неба, шчасця, спакою і дабрабыту!

Няхай мужчыны захоўваюць для вас атмасферу свята не толькі 8 Сакавіка, а кожны дзень, круглы год!

Вы самыя-самыя-самыя — цудоўныя і выдатныя!

Да сустрэчы на Вялікай зямлі!

Мужчыны 13-й БАЭ: Аляксей Гайдашоў, Уладзімір Несцяровіч, Леанід Нікіцюк, Павел Растоў, Сяргей Люты, Уладзіслаў Базылевіч, Павел Шаблыка, Ягор Корзун, Мікалай Зіньковіч, Сяргей Зубрыцкі.

У якасці падарунка беларускія палярнікі даслалі відэавіншаванне, спецыяльна падрыхтаванае для дарагіх і любімых жанчын.

Нагадаем, што 19 кастрычніка 2020 года ў НАН Беларусі быў дадзены ўрачысты старт трынаццатай Беларускай антарктычнай экспедыцыі. На лядовы кантынент адправіліся дзесяць удзельнікаў. Падчас экспедыцыі 2020—2021 гадоў плануецца завяршыць стварэнне першай чаргі інфраструктуры антарктычнай станцыі і яе падрыхтоўку да функцыянавання ў круглагадовым фармаце. Па стане на сярэдзіну лютага змантаваны і ўведзены ў эксплуатацыю шэраг аб'ектаў станцыі. Гэта і трохсекцыйны модуль кіравання, сувязі і навігацыі, і восем секцый службова-жылога модуля, і біялагічная лабараторыя, і новы комплекс дызель-электрастанцыі.

Цяпер рэалізуецца шэраг навуковых праектаў па вывучэнні Антарктыкі. Яны прадугледжваюць даследаванне аэразольнага і газавага саставу атмасферы, УФ-выпраменьвання, а таксама зямной кары ў раёне гары Вячэрняя. Вядзецца маніторынг азонавага слою Зямлі, ловуч участкаў, перспектыўных з пункту гледжання наяўнасці карысных выкапняў, ацэньваюцца магчымасці выкарыстання біялагічных рэсурсаў Антарктыкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«НА СВЯТА ЯШЧЭ НЕ РАЗВУЧЫЛІСЯ ДАРЫЦЬ КВЕТКІ»

«КВЕТКІ ЦЯПЕР — РАСКОША»

Ганна гандлюе кветкамі ў невялікім павільёне ў пераходзе метро вось ужо каля 10 гадоў. Большая частка яе тавару — «родам» з Нідэрландаў, Эквадора, Кеніі. Для крамаў і гандлёвых павільёнаў кветкі купляюць пачкамі — па 20—25 штучак — у буйных аптавікоў, якія маюць справу з замежнымі вытворцамі. Кошт партыі кветак для крамаў прыкладна ў два разы вышэйшы за цану першапачатковай закупкі — у яго закладзены затраты на транспарціроўку, мытныя выдаткі, фітасанітарны кантроль. І ўжо да гэтай цаны прадаўцы дадаюць свой працэнт — так фарміруецца кошт імпартнай ружачкі або хрызантэмы для пакупніка.

Зрэшты, суразмоўніца кажа, што цэны на кветкі цяпер дастаткова дэмакратычныя. Ружы — у залежнасці ад вышыні — ад 4,50 да 6,50, хрызантэмы па 6 рублёў за галінку, гваздзікі і цюльпаны — па 2,50. Раскоша накшталт шыкоўных буйных белых лілей (дарэчы, лілеі беларускія) — 20 рублёў за галінку.

Але ў асноўным, расказвае Ганна, пакупнікі аддаюць перавагу ружам. Прычым — з доўгай ножкай.

— Часам кажу пакупніку: «Вы плаціце за палку, у руж меншай вышыні бутоны таго ж памеру». Але гэта стэрэатып «дорага-багата»: чым вышэйшая ружа, тым прэстыжней яе дарыць. Асабіста мне падабаюцца ружы з кароткім сцяблом. Яны і ў вазе выглядаюць лепш. Што датычыцца колеру руж, то гэта важна для пакупніц-жанчын — калі яны купляюць кветкі сяброўцы або маме, то выбіраюць розныя колеры, часта бяруць двухколерныя ружы. Мужчыны спыняюць выбар, як правіла, альбо на чырвоных, альбо на белых ружах. Часам угаворваю падарыць каханай ружы іншых расфарбовак.

Беларускімі ружамі Ганна не гандлюе — кажа, яны дарагія ў закупцы.

— Па ідэі, яны павінны быць танейшыя за імпартныя, але на выхадзе атрымліваецца практычна той жа кошт, — тлумачыць яна. — Наш буйны вытворца працуе сам ад сябе — вырошчвае і прадае кветкі, на вакзале ў гэтага прадпрыемства вялікія павільёны, дзе гандлююць толькі беларускімі ружамі: па 3,50, можна знайсці нават па 1,80. Я ездзіла, глядзела: ружачкі недарагія, але сцяблінкі тонкія, і бутоны не буйныя. Такіх руж у букеце павінна быць штук 25.

Ганна кажа, нашаму пакупніку больш звыкла купіць тры вялікія ружы. Часам купляюць нават адну. Замежныя вытворцы могуць дазволіць сабе выгадную для пакупніка цану, таму што ў іх велізарныя аб'ёмы, разважае яна.

Сама Ганна не вельмі любіць ружы, аддае перавагу іншым кветкам.

— Можа быць, таму што я кожны дзень гандлюю ў асноўным ружамі, самой мне хочацца нечага іншага. Часам бяру дадому цюльпаны, хрызантэмы або гваздзікшабо. Таксама люблю альстрамерыю, яна доўга стаіць у букеце.

Зрэшты, яшчэ нашы мужчыны любяць дарыць жанчынам ромонкі.

— Часам прыходзяць хлопцы, хочуць купіць ромонкі. Я кажу, зіма, дзе ж ромонкі ўзяць? Ёсць ромонкавая хрызантэма, у яе суквецце такім «ромоначкам» — каб букет добра выглядаў, трэба пяцьсем галінак. Зараз вясна, людзі актыўна купляюць цюльпаны. Я ўжо распрадала ўсе, бачыце — зусім рэшткі. Сёння падвязуць.

Нядрэнна прадаюцца і гатовыя букеты.

— Стараешся рабіць букет так, каб не прыйшлося разбіраць яго на наступны дзень. Таму ў букеты заўсёды ідуць самыя лепшыя кветкі — буйныя ружы, хрызантэмы, герберы. Каб кампазіцыя выглядала даражэйшай, каб букет быў больш аб'ёмны. Некаторыя думаюць, што ў букеты ідуць рэшткі. Так прынята было раней, гадоў 10 таму, калі я толькі пачынала працаваць. Цяпер пакупнікоў стала менш, а канкурэнцыя ў кветкавым бізнесе велізарная. Трэба яе вытрымліваць.

Букет — афармленая фларыстычная кампазіцыя — абыдзецца ў сярэднім ад 50 да 55 рублёў.

Кветкі, якія будуць прадавацца ў гэтыя выхадныя, крамы і павільёны атрымалі ў пятніцу. Ці будуць кветкі з новай партыі даражэйшыя, прадаўцы адказаць не могуць: усё залежыць ад пастаўшчыка. Але наўрад ці цэны на кветкі «падскочаць» у сувязі са святам, кажуць прадаўцы.

— На жаль, кветкі цяпер становяцца раскошай. Досыць часта стаіць малады хлопец, думае, узяць пяць руж ці тры, лічыць грошы ў кашальку. Бывае, пытаюся мужчыну: «Колькі вам кветак?», а ён: «Пагляджу, колькі засталося грошай». Гэта кранальна, калі на кветкі каханай жанчыне аддаюць апошнія грошы. Сапраўды дарагі падарунак, ад усёй душы.

«У ПАЛЮБОЎНІЦЫ БУКЕТ ЗАВЯЎ, А Ў ЖОНКІ СТАЯЎ ДВА ТЫДНІ»

Ці прынята ў нас дарыць жанчынам кветкі — з нагоды і нават без нагоды?

— Думаю, так, — разважае Ганна. — Кветкі ў нас практычна кожны дзень купляюць.

Попыт на яе тавар не паддаецца логіцы, расказвае яна. Часам у будны дзень выручка большая, чым у выхадны. Ну, на 8 Сакавіка, зразумела, продажы будуць вялікія. Гэтае свята — магчымасць прадаць усё, што ёсць, нават тое, што ў іншыя дні засталося б незапатрабаванае. Хоць прадаўцы чакаюць, што продажы ў бягучым годзе не будуць такімі высокімі, як у гэты дзень яшчэ гадоў пяць-сем таму.

— Калі я пачынала працаваць, бывала, кветкі куплялі наўпрост ахапкамі і вазамі. Цяпер «мільён алых руж» каханай дораць рэдка. Хоць бывае і такое. Сёлета ў мяне і 37 руж бралі (мужчына дарыў жонцы на дзень нараджэння), і дваццаць адну. Нядаўна хлопцы ездзілі па станцыях метро, куплялі герберы. У аднаго з іх нарадзілася дачка, і ён хацеў адвезці жонцы ў роддом букет са 101-й герберы. На адным «пункце» столькі ніколі не бывае. Кветкі ж — тавар недаўгавечны, гэта не макароны.

У звычайныя дні, расказваюць прадаўцы кветак, ва «ўтыль» адпраўляецца ад 15 да 20 % іх нястойкага тавару. І гэтыя выдаткі, дарэчы, таксама закладваюцца ў цану для пакупніка.

— Колькі жыве кветка? Парознаму. Залежыць ад таго, як да букета будуць ставіцца. Звычайна хрызантэмы стаяць два тыдні, ружы — да пяці-шасці дзён. У хрызантэмы, напрыклад, вады трэба наліваць мала, дзесьці паўвазы ці крыху менш. А ружы трэба шмат вады, амаль цэлую вазу налівайце, інакш яна да бутона «не дап'е» і хутка завяне. Але ўсё залежыць не толькі ад дагляду за букетам. Адзін наш пастаянны кліент расказваў: купіў у нас тры аднолькавыя букеты — жонцы, дачцэ і палюбоўніцы. Дык вось, у дачкі з жонкай кветкі прастаялі два тыдні, а ў палюбоўніцы завялі на наступны дзень.

«НАКОЛЬКІ КАХАЕ, СТОЛЬКІ КВЕТАК І ДОРЫЦЬ»

— Цюльпаны не любяць ваду, налівайце ў вазу ледзь-ледзь, да узроўню лісцікаў, — папярэджвае пакупніка і дзяўчына, што гандлюе кветкамі ў пераходзе.

У яе ў асартыменце — толькі цюльпаны. Затое надзвычай розныя, дзіўных яркіх расфарбовак. Імправізаваны прылавак зроблены з кардоннай скрынкі.

Да 8 Сакавіка яшчэ пяць дзён, а ў яе ўжо аншлаг: па цюльпаны чарга, прычым большасць пакупнікоў — мужчынскага полу.

— Я прадаю свае цюльпаны, — расказвае прадавец. — Вырошчваю іх у цяпліцах у Тарасаве, недалёка ад Мінска па Гродзенскай трасе. Па два з паловай штучка. Стаяць яны шыкоўна, доўга захоўваюць свежасць.

— Не падаражэюць цюльпаны ў свята?

— Можна было б і падняць цану, але мы гэтага не зробім. З чыста чалавечых меркаванняў.

Па словах суразмоўніцы, нашы мужчыны вартыя павагі.

— Я тут круглы год гандлюю, вырошчваю розныя кветкі. І бачу, што ў нас усё яшчэ ўмеюць прыгожа заляцацца да жанчыны і дарыць каханым кветкі. Няма грошай — купіць тры кветачкі ці нават адну. А наогул, хто наколькі кахае, той столькі кветак і дорыць. Вось учора мужчына адмовіў жанчыне. Яна: «Купі мне адзін цюльпан», а ён ёй: «Абыдзешся»! А другі таксама на 8 Сакавіка летась сваёй спадарожніцы за сотню цюльпанаў падарыў.

Прадавец кветкавага магазіна, што размешчаны ў адным з буйных будаўнічых гіпермаркетаў, меркаванне дзяўчат-калег не падзяляе.

— На маёй памяці дарагіх букетаў мужчыны ў нас не куплялі. Максімум — 50 рублёў на кветкі. Гэта мяжа.

Хоць, кажа ён, продажы ў іх краме — не паказчык.

— У крамаў пераходы метро пакупнікоў забіраюць. Ды і месца ў нашага магазіна не самае ўдалае. Людзі сюды прыходзяць не па кветкі, а па будматэрыялы. Але ў пікавыя дні — напрыклад, напярэдадні 8 Сакавіка і ў сам святочны дзень — вядома, работы ў нас заўсёды шмат.

Цэны тут супастаўныя з сярэднімі па горадзе: ружы (Нідэрланды, Эквадор) — 4,99, 5,59, 6,99, самыя дарагія — са сцяблом 80 см. Герберы — 5,99 за штуку, альстрамерыя — 4,55, хрызантэмы ёсць па 6,99 і па 9.

Суразмоўнік гаворыць, што ў апошнія гады на 8 Сакавіка ўжо дораць не толькі ружы: такім букетам каханую не здзівіш.

— Гэта вясновае свята, і пакупнікі часцей, чым ружы, выбіраюць цюльпаны. І мімозу. Яе дораць саму па сабе або просяць дадаць у букеты, якія складаюць нашы фларысты. Пачым будзе мімоза, пакуль не ведаю — гэта залежыць ад таго, па якой цане яна «прыедзе».

У апошнія гады ў Еўропе замест букетаў модна дарыць кветкі ў вазонах, расказваюць прадаўцы. Але ў нас гэтая мода пакуль не прыжылася.

ПАРАДЫ І ЛАЙФХАКІ

Мы спыталі ў прадаўцоў, як сэканоміць на кветках 8 Сакавіка і зрабіць так, каб букет пражыў як мага даўжэй.

- Купляйце кветкі не 8, а, дапусцім, 5—6 сакавіка. Попыт яшчэ не зашкальвае, можна выбраць найбольш прымальныя суадносіны цаны і якасці. Бо «свежыя» кветкі на прылаўку — на самай справе не такія ўжо і свежыя. Яны не менш як тыдзень «ехалі» да нас здалёк. Так што некалькі дзён нічога не зменяць. Пачакаць да свята кветкі могуць у прахалодным месцы — у гаражы, у склепе. Аптымальная тэмпература — плюс 5—8 градусаў.
- Купіце кветкі оптам — атрымаеце зніжку. А потым разбераце іх на букеты для любых жанчын: жонкі, мамы, дачкі, бабулі. Можна скаапераваць, дапусцім, з калегамі па рабоце ці з суседзямі па пад'ездзе (калі вы іх ведаеце) і знайсці аптавікоў. Тады букет абыдзецца танней.
- Выбірайце ружы і цюльпаны з закрытымі бутонамі. Яны неўзабаве распусцяцца і пражывуць даўжэй, чым ружа раскрытыя суквецці. Хрызантэма не павінна губляць пялёсткі, калі яе крыху патрэсці. У архідэі на пялёстках не павінна быць плямак. І адмоўцеся ад куплі ўжо гатовых букетаў — магчыма, яны былі складзеныя не сёння. Лепш няхай фларыст складзе для вас новы букет.
- Каб букет прастаяў даўжэй, у руж і астраў трэба зрабіць зрэз сцябла даўжынёй каля двух сантыметраў. У хрызантэм можна расплюшчыць канец сцябла з дапамогай малаточка для адбівання мяса. У амарылісаў варта злёгку падрэзаць сцябліны і акунуць іх у гарачую ваду. У вазу, куды вы будзеце ставіць мімозы, лепш наліць цёплую (амаль гарачую) ваду, а не халодную.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

Цюльпаны ў пераходзе — па 2,50 за кветачку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона – ОАО «АСБ Беларусбанк» (Гомельское областное управление № 300), тел. (0232) 512130

Наименование объекта продажи – капитальное строение общей площадью 110,9 м², с инвентарным номером 330/С-23455, расположенное в Гомельской области, Мозырский район, аг. Козенки, ул. Спортивная, 50Г.

Начальная цена продажи составляет 40 185,43 бел. руб. (сорок тысяч сто восемьдесят пять рублей 43 копейки) с учетом НДС.

Сумма задатка – 1000,00 бел. рубля (одна тысяча бел. руб.).

Победителем аукциона оплачивается имущество, относящееся к объекту недвижимости: роллета – 332,56 руб., роллета (1,05*2,1) – 196,70 руб., роллета (1,65*2,1) – 223,50 руб. в количестве 7 штук, роллета (1,02*0,71) – 46,18 руб. в количестве 3 штук, щиток распределительный ЩУР-01 – 68,78 руб., регулятор расхода – 23,52 руб., теплосчетчик ТС-05 4 – 20,15 руб., приточная уст. в комплекте со шкафом (вентиляция) – 100,00 руб. на общую сумму 2 444,75 бел. руб., в том числе НДС по ставке 20 %.

Открытый аукцион состоится 14.04.2021 в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, комната переговоров (помещение на третьем этаже).

Заявление на участие принимается до 13.04.2021 включительно по адресу: г. Гомель, ул. Карповича, 21, кабинет 3: пн.–чт. с 9.00 до 17.00, пт. – с 9.00 до 15.45, г. Мозырь, ул. Ленинская, 6, административно-хозяйственный отдел (Козел Елена Николаевна – тел. 8 (0236) 21-02-23, 8 (029) 113-82-32).

По вопросам, связанным с объектами продажи, обращаться по телефону: (0232) 51 21 30 – Ладыженко Светлана Станиславовна.

Продавец – ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта за счет покупателя.

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление и документа с отметкой банка о внесении суммы задатка на счет № BY69AKBB66708597000020000000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего госрегистрацию;

иностранным юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического или физического лица – доверенность (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель). Доверенность от имени нерезидента Республики Беларусь должна быть легализована в установленном законодательством порядке, перевод на белорусский или русский язык нотариально заверен.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий полномочия (приказ о назначении на должность, или выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены с учетом НДС. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 календарных дней со дня проведении открытого аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомится с объектом продажи и документацией на объект.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

Организатор электронных торгов: Свислочский сельский исполнительный комитет, Минский обл., Пуховичский р-н, г. п. Свислочь, ул. Набережная, 11, тел.: (801713) 24277, 24842.

Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа».

Электронный адрес электронной торговой площадки: www.et.butb.by

Дата проведения электронных торгов: **07 апреля 2021 г.**

Время проведения электронных торгов устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество».

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка *(га)*	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации *(рублей)*	Начальная цена *(рублей)*	Задаток *(рублей)*
1	г. п. Свислочь, ул. Кленовая, 30, 624455900001001051	0,1241	Газоснабжение, электроснабжение и водоснабжение	1611,17 + публикация в СМИ	11777,09	1177,71

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **01 апреля 2021 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.00–13.00, 14.00–17.00).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 10 рабочих дней внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона; в течении двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться в Марьиногорское бюро республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения утвержденной проектной документации на строительство жилого дома.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона) извещает о проведении 7 апреля 2021 года открытого аукциона по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь *(га)*	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена *(бел. рублей)*	Размер задатка *(бел. рублей)*	Расходы по изготовлению документации *(бел. рублей)*
1	**д. Цна, ул. Боровая, д. 30, 623287609601000029,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2019	Имеются подъездные пути, электричество	3000,00	600,00	167,40 руб. + расходы за размещение объявления
2	**д. Ганевичи, ул. Песчаная, д. 10А, 623287601101000202,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2434	Имеются подъездные пути, электричество	4000,00	800,00	1753,45 руб. + расходы на размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона: 7 апреля 2021 в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет.

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 1.04.2021 включительно; к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта, соглашение.

Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Контактные телефоны: 8 (01774) 59-1-35, 59-2-35, 8 (029) 107-16-17

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Извещение о проведении 14 апреля 2021 года аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе

№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Капитальное строение* с инв. номером 500/С-41939 общей площадью 668,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А, наименование – литер Б1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 500/С-41940 общей площадью 635,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А, наименование – литер А1/к. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 500/С-41941 общей площадью 289,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А/2, наименование – здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение* с инв. номером 500/С-41942 общей площадью 201,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 12А, наименование – литер Г1/бл. Здание специализированное складов, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	Площадь – 0,8374 га, кадастровый номер – 500000000004002829	1 352 676,0	135 000,0
2	Капитальное строение* с инв. номером 500/С-44605 общей площадью 843,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Суражская, 15, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (литер А1/к, д), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: литер а – площадка, литер б – ограждение, литер в – железнодорожные пути	Площадь – 0,3087 га, кадастровый номер – 500000000005003710	750 000,0	75 000,0

**Ограничения (обременения): аренда до 31.05.2021 г.*

Продавец имущества: ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 14.04.2021 по предмету торгов № _.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **14 апреля 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.03.2021 по 12.04.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

ЗА ШТО ЎЛЮБІЛАСЯ Ў ЛЯСЫ...

Марцыбела Агінская будавала манастыры і пісала вершы

Кінем позірк з вышыні гадоў на Слонім XVIII стагоддзя, дзе ў той час Элеанора Агінская (з сям'і пінскіх Войнаў) мела пяцёра дзяцей. Галоўным для яе дачок было стаць добрымі жонкамі. Для дасягнення гэтай мэты, акрамя агульных навук — матэматыкі, геаграфіі і лацінскай мовы, — яны знаёміліся з дамаводствам, вучыліся іграць, танцаваць, вывучалі літаратуру. Адным словам, князёўна на выданні павінна была стаць дыяментам — на якую руку яго ні надзень, ён мусіў блішчэць.

СПЕКТАКЛЬ ЯК ВЯСЕЛЬНЫ ПАДАРУНАК

Дачцы Марцыбеле падабаецца аратарскае майстэрства, яна піша вершы, чытае іх перад гасцямі. Вывучэнне лаціны вядзе яе да крыніц веры, яна захапляецца тэалогіяй, як з роўнымі вядзе размовы з каталіцкімі іерархамі, якія час ад часу завітваюць да Агінскіх. Шлюб яе не цікавіць. Гэта клапоціць бацьку, старога Казіміра Агінскага, які бярэ яе аднойчы з сабой у госці да свайго сябра Крыштофа Завішы на Міншчыну. Марцыбела і сын Завішы, Ігнась, знаёмяцца. Яны знаходзяцца ў далёкім сваяцтве, і таму бяседа ў Смілавічах (цяпер Чэрвеньскі раён, 27 км ад Мінска) атрымліваецца ненапружаная і асабліва цёплая. Агінскі лічыць Ігнася годнай партыяй, і бацькі замацоўваюць дамову застоллем.

Потым... потым стары Завіша памёр, Ігнася паклікалі ваенныя справы, і гэтае знаёмства пэўны час не перарастала ў штосьці большае. Наступны крок пасля агледзін павінен быў зрабіць ён, але справы не дазвалялі. І толькі пасля папрокаў ад маці і сясцёр ён завітаў у Слонім, каб прапанаваць руку і сэрца Марцыбеле. Самой нявесце было гадоў 20—25 (на жаль, ніводная крыніца не падае дату яе нараджэння).

Вяселле адбылося ў 1727 годзе, можна меркаваць, у Слоніме, а пры пераездзе да мужа гулялі ў Смілавічах, дзе жылі Завішы. Мінск як цэнтр староства вясельныя ўрачыстасці таксама не абышлі ўвагай. У аналах гісторыі захаваліся звесткі пра пастаноўку на сцэне ў Мінску ў гонар маладых сужэнцаў шматактовай п'есы «Саюз Мінервы і Марса, ці Мудрасці і Сілы ў Канстанціне Астрожскім, найвялікшым палкаводцы свету, палацінам Трокскім аднойчы ўбачаны...» П'есу ставілі маладыя акцёры-метагімнасты мінскіх школ езуітаў.

Канешне, у адносінах да Ігнася гэта было перабольшанне, славы Астрожскага ён не меў, але землякі ганарыліся ім як мечнікам ВКЛ. Магчыма, у арганізацыі гэтай пастаноўкі ўзяла ўдзел і сама Марцыбела.

У якасці дадатку да звычайнага мацярынскага пасагу (з коўдрамі, карункамі, падушкамі і дзявочым гардэробам) бацька адпісаў ёй сваю долю нерухомасці ў тых самых Смілавічах, дзе жылі і мелі маёмасць Завішы.

ЦУДАДЗЕЙНЫ АБРАЗ

Калі Марцыбела апынулася ў Смілавічах, то ўбачыла ўтульнае мястэчка з плошчай, якую акаляў шэраг яўрэйскіх крамак, каля дзясятка не надта багатых на выгляд драўляных дамоў, за якімі, аж да млына на Волме, распасціраліся звычайныя халупы з саламянымі стрэхамі. З плошчы бачыўся невялічкі мінарэт татарскай слабады; ад яе ішла прысада да царквы і невялікага палаца-замка. Палац і царкву пабудаваў у свой час яе дваюрадны дзед — канцлер ВКЛ Марцыян Агінскі. Адзіноякі, ён завяшчаў усе свае маёнткі радні. У знак падзякі яго сястра залажыла недалёка ад Смілавіч вёску Марцянаўка (якая існуе і сёння і мае права на мемарыяльны знак у гонар вялікага канцлера). Само ж мястэчка тады з'яўлялася цэнтрам графства Бакшты і, за выняткам маёнтка Дукора, належала Завішам.

Сям'я мужа цёпла прыняла Марцыбелу. Свякруха, Тэрэза з Тышкевічаў, і яе дарослыя дочкі ўсяляк спрыялі адзінай нявестцы.

Праўда, мінуў год, другі, а дзяцей у маладой пары не з'яўлялася. Каб вырашыць гэта пытанне ў адпаведнасці з пераканаццямі веры, Завішы вырашылі на адлегласці сямі кіламетраў ад Смілавіч, каля царквы ў Лядах пабудаваць манастыр.

Тое месца сярод лесу было намоленае з даўніх часоў. Калі хварэла сама Тэрэза, яе аўдыенцыі дабіўся селянін па прозвішчы Кірык. Ён распавёў, што ноччу яму з'явілася Багародзіца і параіла пабудаваць храм у Лядах. Маўляў, у пані маецца спіс абраза Маці Божай Жыровіцкай, але ў палатах графіні яна адчувае сябе няўтульна і сваю цудадзейную сілу можа праявіць толькі ў храме. Былі дадзены распараджэнні, і такая ўніяцкая драўляная цэркаўка паўстала, Тэрэза перадала абраз туды і, Божа! — паправілася.

Пасля гэтага выпадку пагалоска, што Лядненскі абраз вылечвае ад хвароб, у вокаімгненне разляцелася па краіне. У Ляды да абраза пацягнуліся пілігрымы, і Марцыбела актыўна ўключылася ў падрыхтоўку пабудовы манастыра. Каб павысіць значнасць задумы, яна ў 1731 годзе дабілася ў вялікага князя Аўгуста II прывілей на правядзенне тут двух кірмашоў: на свята Звеставання Божай Маці і у дзень народзінаў святога Яна Хрысціцеля.

Аўстрыйскі дамскі ордэн. Сучасны выгляд.

СЯБРОЎСТВА З ЦАРЫЦАЙ

У 1732 годзе фінансаванне будоўлі набыло абрысы — Ігнась разам з маці і сёстрамі пацвердзілі ў Трыбунале пісьмова, што яны аддзяляюць ад сваёй маёмасці і запісваюць на патрэбы будучага манастыра дзве вёскі — Слабодку (Езуполле) (6 хат) і Грыву (15 хат) з халопамі і правам памолу мукі, а таксама 4000 злотых, якія павінен быў забяспечыць смілавіцкі яўрэйскі кагал. Здавалася, вось-вось будзе закладзены падмурак. Аднак здароўе Ігнася і хваляванні ў краіне, якія ўзмацніліся пасля смерці вялікага князя ў 1733 годзе, не дазволілі адразу прыступіць да будаўніцтва. Трывожную абстаноўку ўскладняла магчымая інтэрвенцыя суседняй імперыі. У 1733-1735 гадах Ігнась як пасланнік Рэчы Паспалітай неаднойчы накіроўваўся да рускай царыцы Ганны (пляменніцы Пятра I) з мэтай урэгулявання пагранічных спрэчак і прызнання ў дружалюбнасці (у Піцеры прозвішча Завішаў было добра вядомае. Аднойчы Пётр I танцаваў на вечарыне з маці Ігнася, а ў час прыёму ў Слуцку падарыў Ігнасеваму бацьку залаты партабак). У гэтых дыпламатычных місіях «старшынство» было за Марцыбелай. Царыца Ганна была яе сяброўкай. Звычайна ў Санкт-Пецярбургу яны разам забаўляліся, абмяркоўвалі навіны музыкі і тэатра. На расстанне Марцыбела атрымлівала ад Ганны падарункі — і зноў у Смілавічы, куды пазней пошта дастаўляла лісты з вензелем царыцы. Дзякуючы жонцы, у 1735 годзе ў гонар Ігнася як пасла новаабранага вялікага князя Аўгуста III, работнікі Санкт-Пецярбургскай акадэміі навук і мастацтваў склалі прывітальны верш (ён і цяпер захоўваецца ў Кунсткамеры).

Не выключана, што царыца Ганна запрашала Марцыбелу на ўрачыстасці зімой 1740 года, у тым лік у і на «вяселле» блазнаў у Ледзяным доме (апісаным у рамане Лажэчнікава).

СТРАТЫ І ДАБРАДЗЕЙНАСЦЬ

У 1732 годзе памерла братавая Марцыбелы — Ганна з Карыбут-Вішнявецкіх. Яна пакінула сіротамі адно пад адно сямёра дзяцей. Праз год не стала роднага бацькі Марцыбелы, а яшчэ праз год пайшоў з жыцця і сам брат Язэп, які не перажыў страту жонкі. Марцыбела замяніла дзецям маці.

У 1738 годзе Ігнась памёр. У запавеце ўсе багацці ён не пабаяўся перадаць сваёй адзінай і любай Марцыбеле.

На цырымоніі пахавання, на якой прысутнічаў амаль увесь вялікакняжацкі двор, Марцыбела, якая славілася красамоўствам, выступіла з вершаванай жалобнай прамовай. Ордэн іезуітаў палічыў за гонар выдаць гэты твор аратарскага майстэрства. У 1740 годзе прамова Марцыбелы ўбачыла свет у Вільні асобнай кніжкай.

Энергічная, нязломная, пасля смерці мужа яна вырашыла давесці да ладу справу пабудовы манастыра, дадала да мужавых сваіх 2000 злотых з даходу мястэчка Журавічы (цяпер Рагачоўскі раён), і распачала будаўніцтва. Распрацоўка праекта і ўзвядзенне пабудоў заняло каля трох гадоў. Ужо ў 1742 годзе было складзена першае апісанне (інвентар) манастыра ў Лядах.

Два дзясяткі лядненскіх манахаў рупілася, каб навучыць найперш, чытанню, пісьму і арыфметыцы, дзеці вывучалі тэалогію і хрысціянскую мараль. Узровень выкладання быў такі, што дазваляў адразу паступаць ва ўніверсітэты. Але найбольшы аўтарытэт Марцыбела займела пасля таго, як выстаралася ў папы Пія VI індульгенцый для пілігрымаў, што прыходзілі ў лядненскі манастыр на святы.

У 1746 годзе (у некаторых крыніцах — 1747-м) Марцыбела за свой кошт пабудавала ў Смілавічах для ксяндзоў-місіянераў дамы, прыгожы двухвежавы касцёл і перадала ім у карыстанне 750 гектараў зямлі. Пры гэтым яна выходзіла з пераканання, што місіянеры будуць выконваць сваю асноўную задачу — прапаведаваць Евангелле ўбогім. Пры касцёле адкрылі інтэрнат для вучняў і школу.

Рука Марцыбелы пакінула след на шматлікіх дакументах маёмасных «разборак». Яна бераўліва складвала і размяркоўвала пасаг для сваіх шасці пляменніц. Пазней пяць з іх выдала замуж за вядомых у Літве-Беларусі жаніхоў. Але галоўным яе гонарам быў пляменнік — «сын» Міхал. Яна рупілася, каб пакінуць яму спадчыну ў найлепшым стане. Калі паволі лёсу маёнтак Дукора апынуўся ў руках гетмана Масальскага, яна адкупіла для Міхала гэтую колішнюю частку Бакштаў Завішаў-Агінскіх.

Рознабаковая адукацыя, на якую не шкадавала грошай цёткa Марцыбела, дала свой вынік: ужо ў 11 гадоў Міхал Казімір Агінскі быў прызначаны вялікім князем на пасаду чашніка і, згодна з традыцыяй, мог удзельнічаць ва ўрачыстых дзяржаўных цырымоніях. У 15 гадоў яму была даверана пасада польнага пісара, які займаўся перапісам войска ВКЛ. Паэт, пісьменнік, драматург — гэта ад цёткі Марцыбелы. Дарэчы, атрымаўшы ў свой час вялікую спадчыну па цёткі, Міхал не забыўся на яе ласкі. У гонар свайго другой маці ён залажыў фальварак Марцыбелішкі.

У беларускай гісторыі асоба Марцыбелы Агінскай пакуль стаіць у цені. Але наўрад ці адшукаецца іншая жаночая постаць, якая б рупілася аб народнай адукацыі і карысталася павагай сучаснікаў больш, чым яна. Ужо хворая, у 1760 годзе Марцыбела ахвяравала базыльянскаму манастыру 8000 злотых, які павінен быў забяспечыць маёнтак Дукора.

У тым жа 1760 годзе Марцыбела Агінская пайшла з жыцця. Яе душа ўзнеслася, але справы мецэнаткі яшчэ доўга ззялі і адлюстроўваліся ў цудатворным Лядненскім абразе. Захавалася песня-паэма, прысвечаная абразу Маці Божай Лядненскай. Лічыцца яна анонімнай, але бачыцца ў ёй почырк рукі Марцыбелы Агінскай:

За што ўлюбілася ў лясы?
Бо часта ў нашыя часы
па пушчах бачым.
Пэўна, самі выпіхаем
цябе грахамі
і выганяем з гарадоў?
Здаўна праслаўляюць
Жыровічы міла.
А зараз Барэны,
Сіроцін ўзлюбіла.
Браслаўе, як Супрасль,
Мегіраў і Кані,
Абрала пакойчыкамі
для пражывання.
Краснабор, Лясная
і блізкія: Дудзічы,
Лядненская пушча —
лічыць не злічыць...
Даволі.
Ў пустынях густых
адшукала ты схоў
З-за нашых нямалых
і частых грахоў...

(пераклад з польскай аўтара).

Віктар ХУРСІК.

Сучасны выгляд храма ў Лядах.

НАШЫ ЖАНЧЫНЫ —

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Н.К. — Ларыса, перад часопісам цяпер няпростая задача: настрой жанчынам псуюць пандэмія, маскі, ды і надвор'е пакуль яшчэ не надта вясновае... Чым вы радуеце чытачак і адкуль самі чэрпаеце пазітыў?

Л.Р. — Кожны чалавек — сам крыніца свайго шчасця, гэтак жа як і няшчасця. А пазітыўных людзей вакол нас, і нашых аўтараў у тым ліку, вельмі шмат. Нямала тых, хто зрабіў сябе сам, адбыўся насуперак абставінам, дапамагае ў гэтым іншым, знаходзіць радасць у штодзённых рэчах і з гэтага ўмее зрабіць свята для сябе і для іншых. «Алеся» — часопіс Беларускага саюза жанчын, і ў гімне БСЖ ёсць такія словы: «Мы жанчыны, і мы за ўсё ў адказе». Пад гэтымі словамі можа падпісацца, напэўна, любая жанчына. І мы ў сваёй рабоце імкнёмся арыентавацца на такіх людзей, якія ўмеюць вакол сябе ствараць астравок пазітыву, бяспекі, пэўных сэнсаў. Хоць мы пішам і пра мужчын, бо нам цікавы іх погляд на свет жанчыны.

Так што персон — адметных, пазітыўных, разумных, сучасных, скіраваных у заўтрашні дзень, тых, хто сёння робіць будучыню, вельмі многа. І аб'ёмаў нашага часопіса часам не хапае, таму штосьці ідзе ў інтэрнэт-версію. Прычым цікавыя жанчыны ёсць усюды, незалежна ад геаграфіі. Пазітыўныя людзі вакол сябе ствараюць пазітыўную атмасферу, якую можна выразіць словамі «дзе я, там і добра», да іх цягнуцца, пра іх цікава чытаць.

Н.К. — А што для вас і вашага часопіса азначае пераемнасць? Нярэдка здараецца, што прыходзіць новы рэдактар, адмаўляецца ад ранейшых падыходаў і пачынае ўсё нанова: я буду рабіць так, як я гэта бачу.

Л.Р. — Напэўна, жаданне рабіць усё па-свойму цалкам пазбегнуць цяжка. Падчас маёй работы ў «Алесі» было ўжо два юбілеі часопіса: 90- і 95-гадовы. І на свята мы запрашалі ўсіх рэдактараў, якія працавалі да мяне. І было відаць, наколькі прыемна маім папярэдніцам, што пра іх не забываюць. Было надзвычай цікава паслухаць іх успаміны і даведацца пра іх бачанне. Марыя Іосіфаўна Карпенка, якая рэдагавала часопіс на працягу 28 гадоў, расказала, як адзначалі юбілей у часы яе рэдактарства. Гэта былі паспяховыя савецкія гады: яны ўсім калектывам проста «скінуліся» па зарплаце, каб дастойна сустрэць высокіх гасцей. Прытым, што тыражы «Работніцы і сялянкі» некалькі дзесяцігоддзяў таму пераўзыходзілі тыражы сённяшняй «Алесі» нават не на адзін парадак.

Увогуле, пераемнасць — вельмі суб'ектыўнае панятце. Я, напрыклад, лічу, што не магу не быць пераемніцай Марыі Карпенкі, Раісы Баравіковай. Для мяне гэта проста вялікія жанчыны. Але калі параўноўваць часопіс таго часу і сённяшні, то зразумела, што яны моцна адрозніваюцца, бо гэта розныя эпохі, і мы звяртаемся да розных пакаленняў.

Магчыма, і пра сённяшні наш часопіс на паперы некаторыя могуць сказаць, што гэта несучасна. Даводзіцца часам чуць, што ўсё можна прачытаць у інтэрнэце. Але ў інтэрнэце ты прачытаў і тут жа забыў, а каб не забыць, усё роўна штосьці раздрукуеш ці робіш закладкі. А часопіс — гэта матэрыяльная рэч, своеасаблівы дакумент эпохі, які застанецца. Можна прыйсці ў бібліятэку і пагартаць часопісы 20-х гадоў мінулага стагоддзя, і ты адчуеш, як і чым жылі тады. Таму тут пераемнасць такая — на кончыках пальцаў. Нельга сказаць, што мы ідзём пад тым жа сцягам, што быў у «Работніцы і сялянкі» ці «Алесі» 20—30 гадоў таму.

Н.К. — Але штосьці нязменнае ўсё роўна застаецца...

Л.Р. — Гэта жанчына і яе праблемы, яе погляд. Толькі гэта ўжо погляд нашай сучасніцы. У кожным часе ў жанчыны свае праблемы, і часопіс на іх рэагуе. Нягледзячы на тое, што ёсць у нас і грамадска-палітычная, і літаратурна-мастацкая тэматыка, але сацыяльная праблематыка чырвонай ніткай праходзіць з 1924 года.

Н.К. — Мы ўжо крыху закранулі мужчынскую тэму. Нягледзячы на тое, што часопіс «Алеся» жаночы, ці ёсць на яго старонках месца для мужчын? Ці могуць яны нешта пачытаць?

Л.Р. — У меру сваіх магчымасцяў мы праводзім сацыялагічныя апытанні, каб зразумець, куды рухацца далей. І пакрысе рыхтуемся да 100-гадовага юбілею. Мы папрасілі заняцца апытаннямі бібліятэкі. Там наш часопіс карыстаецца вялікай папулярнасцю, хоць, на жаль, не ўсе сельскія бібліятэкі могуць яго выпісваць. І тады раённыя бібліятэкі праводзяць «Тыдзень «Алесі». Дык вось, дзякуючы бібліятэкам мы і атрымліваем зваротную сувязь. Наш часопіс чытаюць і жанчыны, і мужчыны — паводле тых сацыялагічных звестак, якія нам даступныя.

Мы стараемся, каб ён быў сямейным і яго маглі чытаць усе: мама, бабуля, дачка, і тата каб нешта для сябе знайшоў. У нас цікавыя субяседнікі, сітуацыі, падарожжы і мясціны. Мы стараемся як мага шырэй закранаць праблемы, каб гэта было своеасаблівае акно ў беларускі свет.

У «Алесі», дарэчы, склаўся пул сяброў. Мы рады, што з намі супрацоўнічаюць нашы вядомыя фотамастакі Альфрэд Мікус і Сяргей Плыткевіч. Яны з задавальненнем адклікаюцца на ўсе просьбы. Напрыклад, да юбілею «Алесі» з Альфрэдам Мікусам мы рабілі сумесную выстаўку жаночага партрэта. Яму гэтая тэма цікавая, і гэта мужчынскі погляд, а мы, у сваю чаргу, бачым, як ён паказвае жанчыну. Такая своеасаблівая зверка гадзіннікаў.

З вялікім шкадаваннем кажу пра мастака Валерыя Шкарубу, якога, на жаль, ужо няма з намі. Ён быў героем нашых матэрыялаў, яго карціны былі ў нас на вокладках. Гэта адзін з нямногіх беларускіх мастакоў, які вельмі дакладна перадаў беларускі характар у жывапісе, прычым не праз партрэты, а праз пейзажы. Успрыманне нашых пораў года, міжсезоння выклікае не смутак, а захапленне. Я вельмі рада, што ў нас быў такі сябар і нашы чытачы праз наш часопіс дакрануліся да яго жывапісу.

А.К. — Ларыса, а ці ёсць у сучаснай жанчыны час на часопісы? Якім павінен быць часопіс, каб зацікавіць сёння?

Л.Р. — Я сябе адношу да прафесійных чытачоў, бо, як і многія людзі майго пакалення, заўсёды вельмі шмат чытала. А апошнім часам злавіла сябе на тым, што чытаць стала менш. Кнігі проста назапашваюцца ў папяровым і электронным выглядзе. Здаецца, і час можна знайсці, і патрэба ёсць, а ўнутраных сіл няма. Бо чытанне — гэта інтэлектуальная праца. Часопіс у гэтым сэнсе — аблегчаны варыянт: там ёсць усяго патрошкі.

«Пэўны стэрэатып — «дзяўчына з вокладкі» — дагэтуль жывы. У нас на вокладцы не проста прыгожая дзяўчына, а асоба. І гэта наша сучасніца».

У мяне на тумбачцы побач з ложкам ляжаць кніга па асобасным росце, «Эмацыянальны інтэлект» па псіхалогіі (нядаўна купіла і пакуль далей за першыя старонкі не прасунулася), жаночыя раманы для заспакаення душы, дэтэктывы. Я разумею, што кнігі збіраюцца, а часу няма. А вось чытаеш тую ж «Алесю» — як птушка, збіраеш па зярнятку: штосьці па псіхалогіі, асобасным росце, парады псіхолагаў, юрыстаў, і за нешта «чапляешся». Інтэрв'ю з уладальнікам агрэсадзібы чытаеш і ловіш сябе на думцы: а гэта нядрэнная ідэя, трэба з'ездзіць. Хтосьці займаецца прыкладнымі мастацтвамі, хтосьці карціны піша. Чытаеш і думаеш: «Было б у мяне шмат часу, таксама гэтым занялася б», ці «Пайду на пенсію і буду рабіць гэтак жа». Такія матэрыялы бадзёраць і пашыраюць кругагляд. Мы ж усё на сябе прымяраем: а чаму я так не раблю?

Наша сяброўка Алена Брава, а яна, на мой погляд, складаная для чытача сучасная пісьменніца, узнімае тэмы, якія хвалююць маладых жанчын: сексізм, фемінізм — рэчы, якія жанчын майго пакалення не вельмі турбуюць, бо мы фарміраваліся ў іншы час. А яна як пісьменніца прэпаруе іх на ўзроўні навукі. І я аддаю гэтаму належнае, бо гэта важна і цікава нашаму маладому чытачу. Гэта тое, што цяпер вельмі хвалюе моладзь. Мы вельмі рады, што Алена Брава вядзе ў нас літаратурны агляд. Я для сябе таксама адкрываю новыя гарызонты: даведваюся, што цікава сучаснай жанчыне, і ў дадзеным рэчышчы думаю, як фарміраваць парадак дня ў часопісе з улікам гэтых паведаў.

А.К. — Якія тэмы ў часопісе ў першую чаргу прыцягваюць увагу? Прыгажосць і здароўе, турызм і адпачынак, кулінарыя, сад-агарод, дызайн?

Л.Р. — Атрымліваецца, што колькі жанчын, столькі і меркаванняў. Для кагосьці сад-агарод — хобі і жыццёвы сэнс, мы пра гэта пішам. І гэта бяспройгрышны варыянт. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца жаночыя расказы. Мне як прафесійнаму чытачу гэта не вельмі цікава. Але ў нас шмат тых, для каго гэта вельмі жыццёва, і па лістах гэта відаць. Некаторых такія расказы нават падштурхоўваюць да ўласных літаратурных спробаў — свае жыццёвыя гісторыі пакласці на паперу. Гэта таксама адчуваецца ў нашай пошце.

Нам увогуле часта прыходзяць пісьмы, якія ўзрушваюць. Быў ліст з Расіі, з Урала. Жанчына, а ёй за 60, чытае матэрыялы з Беларусі. І вырашыла падзяліцца сваёй гісторыяй. Калі ёй было 20 з нечым, і яна працавала на камсамольскай будоўлі, ёй сімпатызаваў хлопец-беларус. Але той не асмеліўся да яе падысці. Так і раз'ехаліся яны ў розныя канцы Саюза. Яна нічога пра яго не ведае, памятае толькі, што завуць яго Мікалай. Жанчына пражыла сваё жыццё, мае дзяцей і ўнукаў. Але гэтая гісторыя сядзіць у ёй стрэмкай, гэты Коля-беларус, як несыграная пласцінка. Мы надрукавалі гэтае пісьмо ў «Алесі», бо тут гатовая жаночая гісторыя. І пад ёй маглі б падпісацца многія жанчыны — такія ўспаміны ёсць, бадай, у кожнай.

А.К. — Ларыса, а якія асобы сёння цікавяць чытачак? Актрысы і тэлевядучыя або звычайныя жанчыны, якія «зрабілі сябе самі»?

Л.Р. — Гэта пытанне нават не да чытачак, а да нашых аўтараў. Журналісты — таксама чытачы і яны шукаюць сваіх герояў, якія ім цікавыя. Вядома, што мы распешчаныя кантактаванем, і здзівіць нас чымсьці складана, бо вельмі шмат даводзіцца мець зносін. Мы заўсёды абмяркоўваем рэдакцыйны партфель: ці цікава, ці карысна гэта будзе чытачу.

Паколькі мы — часопіс Беларускага саюза жанчын, нашы гераіні — гэта лідары грамадскага меркавання. Гэта жанчыны, якія прыйшлі ў самую буйную жаночую грамадскую арганізацыю, чагосьці дасягнулі, да нечага імкнуцца, бачаць сябе ў грамадскім жыцці, а не толькі дома і на рабоце. Таму мы з вялікім задавальненнем расказваем пра лідараў грамадскага меркавання, тых жанчын, што натхнілі сябе і натхняюць навакольных — свецяць, свецяцца, дапамагаюць тым, каму складана і хто ўстроены так, што сам сябе за валасы з бяды не выцягне.

Адна з нашых аўтараў расказвае пра жанчын складанага лёсу, якія прайшлі праз жыццёвыя выпрабаванні, але не зламаліся, выйшлі з іх і служаць прыкладам іншым. Такія гісторыі паказальныя: ты хандрыш, а паглядзі, як было ёй, але яна справілася, знайшла ў сабе сілы. Пра такіх гераінь цікава, карысна і павучальна чытаць і ведаць. Часам бывае, што гераіня гэтая жыве ў тым жа горадзе і можна звярнуцца да яе, атрымаць дапамогу, спытаць парады. Так мы і звязваем нашых чытачоў.

«Партрэт сучасніцы — гэта і разумніца, і прыгажуня. Усё, што можна сказаць станоўчага ў найвышэйшай ступені, — гэта пра беларускую жанчыну».

Н.К. — Цікава, а як вы шукаеце герояў на вокладку?

Л.Р. — Усе памятаюць цудоўную гісторыю, як выйшла замуж спявачка Сафія Ратару. Яна трапіла на вокладку часопіса. А яе суайчыннік, які дзесьці далёка служыў у войску, убачыў яго і сказаў: вось якія цудоўныя ў нас дзяўчаты, прыйду з войска і з ёй ажанюся. Так і адбылося.

Пэўны стэрэатып — «дзяўчына з вокладкі» — дагэтуль жывы. У нас на вокладцы не проста прыгожая дзяўчына, а асоба. І гэта наша сучасніца. А яны вельмі розныя: народная майстрыха з Дома рамёстваў Глыбокага, удзельніца народнага ансамбля танца з райцэнтра Магілёўскай вобласці, юная балерына, якая праз некалькі гадоў, магчыма, стане сусветна вядомай, оперная спявачка Аксана Волкава, якой захапляецца ўвесь свет, жаночы лідар. Але гэта

«Калі жанчыне было 20 з нечым, і яна працавала на камсамольскай будоўлі, ёй сімпатызаваў хлопец-беларус. Але той не асмеліўся да яе падысці. Так і раз'ехаліся яны ў розныя канцы Саюза».

АШАЛАМЛЯЛЬНЫЯ!

дакладна не толькі актрысы, тэлевядучыя, але і простыя працаўніцы. Іх захапленні, майстэрства маштабуюць. І гэтым яны цікавыя.

«Мы ў сваёй рабоце імкнёмся арыентавацца на такіх людзей, якія ўмеюць вакол сябе ствараць астравок пазітыву».

Як атрымалася адна з нашых вокладак? Я папрасіла нашу журналістку напісаць матэрыял пра маляванкі. Яна паехала ў Глыбокае, і там у Доме творчасці пагутарыла з майстрыхай. І калі прывезла яе фотаздымак, я зразумела: гэта ж вокладка! Фота такое цёплае, жанчына свеціцца знутры. Вось так і робяцца нашы вокладкі. І я разумею, што для невялікага Глыбокага гэта, магчыма, і своеасаблівая мінісенсацыя.

Напэўна, часам мы і памыляемся. Творчы чалавек не можа без сумненняў. Я таксама заўсёды сумняваюся ў тым, што раблю. І не магу на 100 % сказаць, што гэта абсалютна ўсім цікава — так не бывае. Іншае пытанне, з кім мы канкуруруем. Жаночых часопісаў цяпер шмат: і беларускія, і расійскія, і агульнаеўрапейскія. Мы не можам і не імкнёмся з імі канкураваць. Там іншы падыход і іншыя мэты. Глянец — часопіс пра недасягальнае, пра тое, да чаго, магчыма, і не варта імкнуцца. Як Мона Ліза, на якую можна паглядзець, натхніцца, але неабавязкова валодаць гэтай карцінай. Той жа Vogue — гэта як высокае мастацтва. Наш часопіс прыкладны: ён пра жыццё тут і цяпер, пра тых людзей, якія жывуць вакол нас і на якіх можна раўняцца.

А.К. — А хто сучасная чытачка «Алесі»?

Л.Р. — Мы пазіцыяную сябе як сямейны часопіс, таму немагчыма вызначыць узрост нашага чытача. Дома яго чытаюць усе: і бабуля, і маці, і дачка знойдуць там штосьці для сябе. Таму «Алеся» такая эклектычная, бо мы стараемся быць карыснымі для ўсіх. І нашы аўтары рознага ўзросту: ад зусім маладзенькіх дзяўчат да сталых жанчын. Таму і чытацкая аўдыторыя дастаткова шырокая. Большасць, напэўна, жанчыны старэйшага ўзросту, якія не так актыўна карыстаюцца інтэрнэтам. Не трэба забываць, што бібліятэкі ў невялікіх населеных пунктах выконваюць ролю клубаў. Гэтак жа як на Захадзе жыхароў аб'ядноўвае паб, так у нас у сельскай мясцовасці і невялікіх гарадах вакол бібліятэк утвараюцца свае клубы па інтарэсах.

Калектыў «Алесі» і нашы сябры — музыканты, мастакі, іншыя творчыя людзі, нярэдка запрашаюць у такія бібліятэкі па ўсёй краіне на тэматычныя вечары. Праз эпідэмію мы цяпер пакуль не ездзім у рэгіёны, а абмежаваны Мінскам, але, мяркую, гэтая традыцыя адновіцца. Я бачу, што на сустрэчу прыходзіць чытацкі пул бібліятэкі, яны задаюць такія цікавыя пытанні — пра герояў публікацый, пра жыццё, пра палітыку — усё, што хочаце. Выдатна, што бібліятэкі выконваюць сацыяльную функцыю. Гэта цікавы трэнд, і мы яго ўлічваем у сваёй рабоце.

Н.К. — Ларыса, вы як рэдактар сустракаецеся з вялікай колькасцю жанчын. Які ён, партрэт сучаснай беларускі? Чым нашы жанчыны адметныя і што вам у іх падабаецца?

Л.Р. — Мне ўвогуле вельмі падабаюцца беларускія жанчыны. Я 10 гадоў пражыла ў Маскве, у такім своеасаблівым еўрапейска-азіяцкім агламерацце. І гэты вопыт, і вопыт журналісцкага кантактавання дае мне падставы сапраўды захапляцца беларускімі жанчынамі. Партрэт сучасніцы — гэта і разумніца, і прыгажуня. Усё, што можна сказаць станоўчага ў найвышэйшай ступені, — гэта пра беларускую жанчыну.

«Чытанне — гэта інтэлектуальная праца. Часопіс у гэтым сэнсе — аблегчаны варыянт: там ёсць усяго патрошкі».

У юнацтве я пазнаёмілася з беларускай, якая жыла ў Северараморску. Яе муж — падводнік. Паколькі яны сыходзяць на некалькі месяцаў на вахту, шлюбы часта развальваюцца, і распаўсюджаны паўторныя. Але ў тых сем'ях, дзе жонкі — беларускі, як правіла, усё добра. Таму вельмі шмат калег яе мужа пабраліся другім шлюбам з беларускамі. Мяне тады гэта ўразіла і засталося ў памяці.

А з гадамі я назірала жыццё і вярталася да гэтай гісторыі. Беларускі — гэта такія ўсходнія жонкі. Яны, здавалася б, і не выходзяць уперад мужа, не ставяць рукі ў бокі, а застаюцца той «шыяй», на якой трымаецца «галава». Хоць і нас закрануў агульнасусветны трэнд: нельга сказаць, што ўсе сем'і захоўваюцца. Але беларускі ўмеюць стварыць вакол сябе астравок спакою, самі пераменяць годнасць і ўпэўненасць і ведаюць, што з мужам ці без яго ім трэба ісці наперад. І гэтае ўменне жыць прыгожа, шчасліва, весела не можа не захапляць. Сённяшняя жанчына ведае, чаго яна хоча ад жыцця, ад сябе, ад грамадства. Жанчыны актыўныя паўсюль, прытым што ніхто з іх не здымаў клопат аб доме і дзецях. Таму беларускія жанчыны для мяне ашаламляльныя.

І на старонках нашага часопіса менавіта такія гераіні: і дома яна цікавая, і на рабоце яна лідар, і хобі ў яе ёсць, а яшчэ яна і мама, і ў яе шмат дзяцей. І для ўсіх хапае і цярпення, і цяпла. Вось такая наша сучасніца — яркая, выдатная жанчына.

А.К. — Вы пачалі расказваць пра пісьмы... А якія матэрыялы атрымалі жывы водгук у аўдыторыі? Аб чым просяць чытачкі ў сваіх пісьмах?

Л.Р. — У нас склалася такая практыка, што ў лістопадзе мы робім літаратурны выпуск. У многіх гарадах і раёнах ёсць літаратурныя аб'яднанні, і мы друкуем іх найлепшыя, на наш погляд, вершы. І гэта заўсёды выклікае водгук: нас пасля завальваюць пісьмамі з вершамі. Цяжка тут ацэньваць мастацкую вартасць, але з'яўляецца шквал лістоў, і відавочна, што людзі хочуць самавыявіцца і пачуць ацэнку. Ты разумееш, што з літаратурнага пункта погляду гэта не самы моцны твор, але як можна здзьмухваць пылок з крылаў? У чалавека павінен быць палёт, і няхай ён будзе такі.

Вельмі любяць нашага аўтара Ларысу Мятлеўскую, якая расказвае пра народныя стравы. Яна вядзе і тэлеперадачу, прысвечаную беларускай кухні. Спачатку вядоўца прыходзіць у дом праз тэлевізар, а потым людзі бяруць часопіс і там знаходзяць яе кулінарныя парады і рэцэпты. Ведаю па нашай чытацкай пошце, што гэта вельмі падабаецца. Хтосьці згадвае, што так гатавала бабуля, хтосьці эксперыментуе: а няўжо так можна было? Гэта заўсёды цікава.

Бяспройгрышная тэма, як я казала, — сад-агарод. Вельмі цікавяцца нашы чытачкі вышыўкай, вязаннем — тыя рэчы, якія людзі могуць рабіць самі, але заўсёды вабіць нешта новае: а ці змагу я так?

«Калі параўноўваць часопіс таго часу і сённяшні, то зразумела, што яны моцна адрозніваюцца, бо гэта розныя эпохі, і мы звяртаемся да розных пакаленняў».

Н.К. — Калісьці тады яшчэ «Работніца і сялянка», каб павялічыць тыраж, пачала друкаваць выкрайкі. І гэта спрацавала: жанчыны ва ўмовах дэфіцыту адзення пачалі самастойна выкройваць і шыць. Тыраж «Работніцы і сялянкі» рванўў за мільён. Гэта быў бяспройгрышны ход. Цяпер патрэба ў выкрайках адпала, а ў тыражах — засталася. Чым вы сёння «чапляеце» чытача? Якое жыццёвае крэда часопіса?

Л.Р. — Быць цікавымі для як мага больш шырокага кола жанчын рознага ўзросту, рознай прафесійнай і сацыяльнай прыналежнасці. «Алеся» — часопіс Беларускага саюза жанчын. У БСЖ 140 тысяч чалавек, і гэта наша мэтавая аўдыторыя. Калі б часопіс выпісала кожная «пярвічка» арганізацыі, было б цудоўна!

Алена КРАВЕЦ.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Дэмаграфія

Нараджэнне другога дзіцяці ў сям'і — прыярытэт дзяржавы

У Беларусі прыкладна 60 % сем'яў з дзецьмі выхоўвае толькі адно дзіця. Такую лічбу агучыў журналістам намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ.

Улічваючы вялікі працэнт аднадзетных сем'яў, дзяржаўная палітыка ў сферы дэмаграфіі будзе накіравана на стымуляванне нараджэння другога і наступных дзяцей. Да такіх мер адносяць павышэнне даступнасці жылля для маладых сем'яў (арэнда, іпатэка, будзберажэнні), дапамогу для сем'яў з дзецьмі, забеспячэнне занятасці абодвух бацькоў, стварэнне ўмоў, дружалюбных сем'ям, карпаратыўную палітыку наймальніка, развіццё паслуг па доглядзе за дзецьмі.

«Адзін з прыярытэтаў развіцця на пяцігодку — шчаслівая, здаровая сям'я, — сказаў Валерый Кавалькоў. — Мы назіраем зніжэнне колькасці нараджэння першых і другіх дзяцей. Але дзякуючы мерам падтрымкі шматдзетных сем'яў, нараджальнасць трэціх і наступных застаецца стабільнай. З 2015 года каля 20 тысяч дзяцей нараджаецца трэцімі і наступнымі штогод. Па даных перапісу насельніцтва 2019 года, у краіне 1227 тысяч хатніх гаспадарак з дзецьмі да 18 гадоў, у іх выхоўваецца 1 858 тысяч дзяцей. 60 % — гэта сем'і з адным дзіцем, сем'і з двума дзецьмі — 31 %, і сем'і, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, — 8,7 %».

Пры гэтым ён дадаў, што за 10 гадоў (з моманту папярэдняга перапісу) доля сем'яў з трыма і больш дзецьмі прыкметна павялічылася: тады яна складала 5,2 %.

Плануецца пашырыць напрамкі датэрміновага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу.

«Найбольш запатрабаванае — пагашэнне запазычанасці па крэдыце грамадзян, якія самастойна заключылі дагаворы на будаўніцтва жылля; пагашэнне пазык, дадзеных па месцы работы грамадзян на будаўніцтва ці набыццё жылля; набыццё долі ў праве ўласнасці на жылыя памяшканні. Таксама разглядаецца пытанне датэрміновага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу на куплю артапедычных вырабаў і сродкаў тэхнічнай і сацыяльнай рэабілітацыі для дзяцей-інвалідаў», — канкрэтызаваў намеснік міністра.

Будзе развівацца сістэма дзяржаўных дапамог: на яе ў бягучай пяцігодцы плануецца накіраваць Br16 млрд. Плануецца, што за пяць гадоў сярэдні памер дапамогі па доглядзе за дзіцем да 3 гадоў вырасце ў паўтара раза, а яго рэальны памер павялічыцца ў 1,2 раза.

Прапрацоўваецца пытанне магчымага скарачэння рабочага дня да 7 гадзін для працуючых бацькоў.

Міжнародны вопыт паказвае: нараджальнасць вышэй за сярэднюю дэманструюць тыя краіны, дзе развіта сістэма паслуг па доглядзе за дзецьмі ранняга ўзросту. У Беларусі для гэтага трэба будзе правесці вялікую работу. Ужо цяпер попытам карыстаецца паслуга нянек, якая пакуль даступная толькі некаторым катэгорыям сем'яў.

Валерый Кавалькоў удакладніў, што на рэалізацыю падпраграмы «Сям'я і дзяцінства» дзяржпраграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека» будзе накіравана Br2,2 млрд (гэта сродкі, не ўлічваючы дапамогу).

Наталья ТАЛІВІНСКАЯ.

8 Сакавіка ў беларускай філуменіі

Тых, хто займаецца калекцыяніраванне запалкавых этыкетак ці пачкаў ад запалак называюць філуменістамі, а калекцыяніраванне этыкетак з пачкаў ад запалак, буклетаў (кніжак-запалак) і іншых прадметаў, звязаных з запалкамі, называецца філуменіяй (ад грэцкага «phileo» — люблю і лацінскага «lumen» — агонь ці святло).

Сёння філуменія не з'яўляецца распаўсюджаным хобі, як, напрыклад, калекцыяніраванне манет, паштовых марак, паштовак, самавараў, прасаў, але аматары гэтай навукі працягваюць развіваць сваю калекцыю. Хачу адзначыць, што кошт на запалкавыя этыкеткі і запалкі XIX—XX стагоддзяў анічуць не нiжэйшы чым, напрыклад, на банкноты ці манеты гэтага перыяду.

Але не пра гэта сёння размова, а пра свята 8 Сакавіка — Міжнародны жаночы дзень на запалкавых этыкетках беларускіх прадпрыемстваў. Згадка пра 8 Сакавіка ўпершыню на запалкавых этыкетках з'явілася ў Беларусі ў 1955 годзе. Тады Барысаўскі фанерна-запалкавы камбінат выпусціў да Міжнароднага жаночага дня запалкі з этыкеткай на рускай мове, на якой было напісана «Міжнародны жаночы дзень» і вялікая лічба 8.

Праз чатыры гады — у 1959-м — той жа Барысаўскі фанерна-запалкавы камбінат выпускае серыю запалкавых этыкетак на рускай мове з невялікімі малюнкамі і тэкстамі: «8 Сакавіка — Міжнародны жаночы дзень». Выйшла тры этыкеткі. Дзве этыкеткі былі амаль падобныя з яркімі лічбамі 8, а трэцяя — выглядала інакш, крыху прыгажэй. На ёй акрамя тэксту: «8 Сакавіка — Міжнародны жаночы дзень» былі адлюстраваны два букеты кветак — вялікі над лічбай 8 і маленькі букет унізе этыкеткі каля лічбы 8.

Акрамя Барысаўскага фанерна-запалкавага камбіната ў 1959 годзе падобныя тры этыкеткі на запалках выпусціў і Гомельскі фанерна-запалкавы камбінат. Адрозніваліся яны толькі колерамі.

У 1966 годзе дзве арыгінальныя этыкеткі выпускае Пінскі фанерна-запалкавы камбінат. На адной запалкавай этыкетцы на фіялетавым фоне намалявана галава дзяўчыны з прычоскай у верхнім кружочку васьмёркі. У левай руцэ дзяўчына-васьмёрка трымае гваздзік, а ў правай — голуба. З двух бакоў васьмёркі напісана слова — сакавіка (марта), а ўнізе на рускай мове тэкст: Міжнародны жаночы дзень.

Другая падобная этыкетка выканана на руковым фоне. Праўда, дзяўчына ў руках трымае і голуба, і цюльпан, а на яе галаве надзета нешта падобнае на самбрэра.

Гэта, бадай, і ўсё, што датычыцца 8 Сакавіка ў беларускай філуменіі. Таму нам цяпер застаецца толькі павіншаваць філуменістак са святам і пажадаць новых калекцый.

Сяргей ЧЫГРЫН.

Приорбанк RBI Group

«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А, извещает своих акционеров, что 30 марта 2021 года в 10.00 состоится очередное Общее Собрание акционеров банка

Собрание будет проводиться в очной форме по адресу: г. Минск, ул. Сторожовская, 15, большой конференц-зал гостиницы «Беларусь».

Орган, созывающий собрание акционеров – Наблюдательный Совет «Приорбанк» ОАО.

Лица, имеющие право на участие в Собрании, имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению Собрания, за 20 дней до начала Собрания в Центральном офисе «Приорбанк» ОАО по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А (в рабочие дни и часы банка), а 30 марта 2021 – по месту проведения Собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в Собрании, составляется на основании реестра владельцев акций «Приорбанк» ОАО по состоянию на 05.03.2021.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, будет осуществляться 30 марта 2021 года с 8.30 до 9.45 по месту проведения очередного Общего Собрания акционеров при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия, путем внесения сведений об участнике в автоматизированную информационную систему регистрации участников Собрания и составления списка лиц, зарегистрировавшихся для участия в Собрании, содержащего подписи этих лиц.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность, представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц-акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

Повестка дня Собрания

1. Отчет Наблюдательного Совета банка за 2020 год.
2. Отчет Правления о работе банка за 2020 год.
3. Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2020 год. Утверждение годовых отчетов, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2020 год; распределение прибыли за 2020 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
4. Установление размера дивидендов и срока их выплаты.
5. Утверждение изменений в Устав «Приорбанк» ОАО.
6. Утверждение изменений в Положение о Наблюдательном Совете «Приорбанк» ОАО.
7. Определение размера вознаграждения члену Наблюдательного Совета (представителю государства) за исполнение им своих обязанностей.
8. Избрание членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО.
9. Избрание членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО.

Наблюдательный Совет, Правление «Приорбанк» ОАО

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 24.07.2019 года. УНП 100220190.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «БЕЛМЕТСТРОЙСЕРВИС»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «БЕЛМЕТСТРОЙСЕРВИС»** (УНП 190421288) в лице ликвидатора Д.А. Куприянова.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **18 марта 2021 г.**, 09.00–17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

Предмет торгов – **капитальное строение, инв. № 500/С-1684 – здание административно-хозяйственное общей площадью 706,86 кв. м** (344,0 кв. м до реконструкции) по адресу: **г. Минск, ул. Фабрицыуса, д. 8.**

Начальная цена – 497 800,00 бел. руб., в т.ч. НДС по ставке 20 %.
Шаг торгов – 24 890,00 бел. руб., задаток – 49 780,00 бел. руб.

Для участия в торгах необходимо в срок с 08.03.2021 г. 09.00 по 17.03.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет электронных торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня их проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 11.12.2020 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего частного предприятия «Аналитик-центр» в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» в составе

№ лота	Наименование	Начальная цена, без учета НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	**Капитальные строения (прирельсовый склад хранения лаков и красок, инв. № 610/С-53946, общая площадь – 424,3 м²)**, **капитальное строение (станция перекачки, инв. № 610/С-53944, общая площадь – 41,8 м²)**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001118 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, д. 36, корп. 10	27 450,00	2 745,00
2	**Капитальное строение (электроцех, цех раскроя фанеры, компрессорная, инв. № 610/С-53929, общая площадь – 639,2 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001095 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/17	48 870,00	4 887,00
3	**Капитальное строение (здание трансформаторной подстанции, инв. № 610/С-53943, общая площадь – 350,1 м²), капитальное строение (низконапорная станция перекачки сточных вод, инв. № 610/С-53941), сооружение (труба дымовая кирпичная, инв. № по бух. учету 20014**, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002774 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36	68 364,00	6 836,00
4	**Капитальное строение (пост приема и выдачи нефтепродуктов, инв. № 610/С-53945, общая площадь – 47,3 м²)**, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002786 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/8	3 600,00	360,00
5	**Капитальное строение (сушильно-раскроечный цех**, **общая площадь – 2023,5 м²),** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36Г	86 130,00	8 613,00
6	**Капитальное строение (газораспределительный пункт, общая площадь – 35,7 м², инв. № по бух учету 40029/2),** расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/1	4 590,00	459,00

Стоимость по лотам №№ 1–6 снижена на 10 % от первоначального размера.

В соответствии с абзацем 4 п.1.2 Указа Президента Республики Беларусь от 05.02.2013 № 63 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)» государственная регистрация создания капитальных строений, которые выставлены на торги без наличия документов, будет осуществляться в установленном порядке по заявлению покупателя и за его счет.

На Покупателя (Победителя торгов, Единственного участника) каждого лота (№№ 1–6), выставленного на торги по продаже недвижимого имущества ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» (Продавца), возлагается обязательство по принятию на хранение движимого имущества Продавца, находящегося в приобретаемых объектах, на срок до его реализации или утилизации. Хранение осуществляется без взимания платы. Приемка и возврат принятого на хранение имущества удостоверяется актами приема-передачи имущества, являющимися неотъемлемой частью договора купли-продажи. В период хранения Покупатель обязуется обеспечить представителям Продавца свободный доступ к движимому имуществу, переданному на хранение.

На Покупателя/Покупателей лота № 2 возлагается обязанность по обеспечению свободного доступа к РУ, РП и линиям, исходящим от них, находящиеся в приобретаемых Объектах и на соответствующих земельных участках, для сотрудников энергоснабжающей организации, а также обязанность по обеспечению полного ограничения доступа к РУ, РП и линиям, исходящим от них, для третьих лиц по правилам технической и энергетической безопасности.

По объектам сушильно-раскроечный цех, составляющий лот № 5, и газораспределительный пункт, составляющий лот № 6, отсутствует государственная регистрация, а также он находится в аварийном состоянии. По объекту труба дымовая кирпичная, включенному в лот № 3, отсутствуют какие-либо документы.

Так как объекты, содержащиеся в лоте № 2 и лоте № 3, являются частями энергоснабжающей системы, условием заключения договора с Покупателем любого из указанных лотов будет обязанность по покупке другого лота. Кроме того, на данного Покупателя возлагается дополнительная обязанность по приобретению (заключению договора купли-продажи) единого энергоснабжающего комплекса ОАО «БПМИ» (включающего трансформаторы, камеры КСО, РУ, РП, КЛ и хозяйство электросиловое) общей стоимостью 945,90 бел. руб. в течение 30 банковских дней после заключения договора купли-продажи объектов по лотам № 5 и № 6. С полным списком имущества, входящего в единый энергоснабжающий комплекс, можно ознакомиться у антикризисного управляющего – ЧПУП «Аналитик-центр» (тел. для справок: 8 (017) 378-05-66, адрес эл. почты: analitik-centr@tut.by).

Газораспределительный пункт, составляющий лот № 6, располагается на земельном участке с кадастровым номером 640400000008000182 совместно с капитальным строением (бойлерной) и сооружением (навесом для ПВМ), реализованными ранее в рамках дела о банкротстве ОАО «БПМИ».

Сушильно-раскроечный цех, составляющий лот № 5, располагается на земельном участке с кадастровым номером 620850100008001100 совместно с капитальным строением (насосной станцией 2-го подъема), реализованным ранее в рамках дела о банкротстве ОАО «БПМИ».

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течении 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона.

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведение данного платежа;
- на Покупателя возлагаются расходы, понесенные организатором торгов при проведении торгов по продаже имущества должника, в том числе оплата размещения сведений о торгах в СМИ;
- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ, демонтажа;
- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течении шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которыми можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.01.2021.

Аукцион состоится **22.03.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.03.2021** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

УНП 600012350

КАМЕНДАНЦКІЯ ЧАСЫ

Чым падграецца глабальная пратэсная хваля?

Адлік смерцяў ад ускладненняў, выкліканых каранавірусам, пайшоў на мільёны па ўсім свеце. Людзі стаміліся ад лакдаўну і беспрацоўя і выходзяць на пратэсты, а надзея перамагчы пандэмію ўсеагульнай вакцынацыяй, падобна, растае на вачах: прэпараты па-ранейшаму недаступныя ўсім ахвотным і ў найбліжэйшы час сітуацыя наўрад ці зменіцца, адзначае lenta.ru. Да гэтага дадаліся і іншыя праблемы: ашуканцы выкрадаюць грошы, прызначаныя пацярпелым ад крызісу, і прадаюць падробленыя вакцыны, а СААЗ прадракае ўзнікненне суперінфекцый, больш страшных, чым цяперашні каранавірус. Чым падграецца глабальная пратэсная хваля?

НЯМА ПРАСВЕТУ

Пасля ўвядзення ў Нідэрландах каменданцкай гадзіны 22 студзеня ў краіне пачаліся масавыя пратэсты, якія хутка перараслі ў сутыкненні з паліцыяй. Пратэстоўцы, у асноўным моладзь, атакавалі камянямі і кактэйлямі Молатава, паліцыя адказвала вадамётамі і слёзатачывым газам. У шэрагу гарадоў былі разбітыя вітрыны крамаў і прыпынкі грамадскага транспарту, спынены чыгуначныя зносіны, у мястэчку Урк нават падпалілі цэнтр тэсціравання на COVID. Агульны адлік затрыманых пайшоў на сотні чалавек. Па паведамленнях паліцыі, гэта былі найбуйнейшыя беспарадкі ў краіне за апошнія сорак гадоў.

«Гэта ўсё з-за віруса, які наогул забіў не так ужо і шмат людзей. Многія галадаюць, не могуць працаваць і забяспечваць сябе. Я не лічу гэта ўсё нармальным», — з такой заявай выступіў адзін з пратэстоўцаў на дэманстрацыі супраць каранавірусных абмежаванняў у Бруселі. Мірнае шэсце скончылася затрыманнем каля паўтысячы чалавек, а ў яго ўдзельнікаў выявілі прадметы, якія звычайна не бяруць на мірныя акцыі, — напрыклад, піратэхніку і нажы.

Акрамя Бельгіі, 2021 год пачаўся з пратэстаў жыхароў Даніі, Аўстрыі, Нідэрландаў, Славеніі, Францыі і Іспаніі. Многія з іх лічаць, што лакдаўн ужо не дапамагае змагацца з распаўсюджваннем COVID-19. Пры гэтым у асноўным яны выказваюць сваё меркаванне без дапамогі піратэхнікі і нажоў. Так, французскія работнікі сферы культуры зладзілі тусоўку пад электронную музыку ў горадзе Перпіньян, а брытанскія пратэстоўцы ўсталі грудзьмі не за рэйвы, але за пабы: жыхары Оксфарда сабраліся на мітынг, патрабуючы нарэшце адкрыць піцейныя ўстановы.

У студзені ў Швейцарыі прапанавалі ўвесці забарону на забароны з-за каранавіруса. Члены асацыяцыі «Сябры канстытуцыі» сабралі вялікую колькасць подпісаў, каб правесці рэферэндум аб пазбаўленні ўладаў канфедэрацыі права ўводзіць рэжым ізаляцыі і іншыя ковідныя абмежаванні.

У пратэстоўцаў ёсць свая праўда: сітуацыю з COVID-19 назвалі пандэміяй яшчэ ў сакавіку 2020-га — амаль год таму, а прасвету ўсё яшчэ няма, заўважыла lenta.ru. Многія выходзяць на мітынгі з адчаю: людзі страчваюць работу і цярпенне. Так, Міжнародная арганізацыя працы (ILO) паведаміла, што колькасць гадзін, адпрацаваных у свеце на піку першай хвалі, скарацілася на эквівалент 500 мільёнаў рабочых месцаў, а заробак — на 10 працэнтаў. Колькасць амерыканцаў, якія атрымліваюць прадуктовыя талоны для бедных, павялічылася на 20 працэнтаў за апошні год (з 36 да 44 мільёнаў чалавек).

ТАЎСЦЕЮЦЬ І СПІВАЮЦЦА

Акрамя таго, пацярпела і псіхічнае здароўе людзей. Па звестках Цэнтраў па кантролі і прафілактыцы захворванняў ЗША, сімптомы трывожнага і дэпрэсіўнага расстройстваў з красавіка да чэрвеня 2020-га выявілі ў значна большай колькасці людзей, чым за той жа перыяд у 2019-м. Напрыклад, па даных за 2019 год прыкладна 19,1 працэнта паўналетніх жыхароў ЗША расказалі аб праблемах з трывожным расстройствам. У 2020-м працэнт павялічыўся да 30,9 — характэрна, што гэта звесткі толькі за першую палову года, і да яго канца колькасць тых, хто пакутуе на трывожныя расстройствы, магла стаць яшчэ большая.

Некаторыя адзначаюць, што заўважылі пагаршэнне стану менавіта падчас лакдаўну, таму гнеў пратэстоўцаў, якія патрабуюць спыніць узмацненне жорсткасці мер па барацьбе з COVID-19, можна зразумець. «Я лічу, што каранцін быў абсалютным кашмарам. У мяне і так праблемы з псіхічным здароўем з-за траўмы мозга, і з-за яе ж мне трэба кожны дзень шмат рухацца», — падзяліўся праблемамі Рыкі Фрост з горада Мідлсбра ў Англіі.

Вось ужо больш чым 11 тыдняў у Германіі закрыта практычна ўсё за выключэннем аптэк і харчовых крамаў, паведаміла dw.com. Зімовыя вакацыі, што пачаліся перад Калядамі, расцягнуліся з двух тыдняў да двух месяцаў. Лакдаўн немцам парадкам надакучыў. «Многія эмацыянальна выматаныя, не бачаць перспектывы», — сказала dw.com Крысціяне Вопен, старшыня Еўрапейскага савета па этыцы і член групы саветнікаў па праблемах каранавіруса прэм'ер-міністра Паўночнага Рэйна-Вестфаліі. Медыкі рэгіструюць павышэнне колькасці псіхічных расстройстваў і пацыентаў з дэпрэсіяй. А многія, хто вымушаны працаваць на аддаленцы, вядуць нездаровы спосаб жыцця, спяваюцца і таўсцеюць, адзначыла dw.com.

Апытанне, якое было праведзена інстытутам INSA-Consulere у Берліне і Брандэнбургу, паказала, што 43 працэнты жыхароў гэтых дзвюх федэральных зямель Германіі за час лакдаўну заўважна прыбавілі ў вазе. У сярэднім на 5,5 кілаграма, а 14 працэнтаў з іх — на 10 і больш кіло! Прычына — не толькі сядзячы спосаб жыцця і работа ў хоум-офісе, але і ежа не дзеля спатольвання голаду, але ад нуды і безвыходнасці. Нямецкія эксперты настойліва не рэкамендуюць есці дома на сваім рабочым месцы, нават калі гэта месца — кухонны стол: трэба хоць бы перасесці на іншы яго канец.

ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ РАДЫКАЛАЎ

Вулічныя пратэсты супраць каранцінных абмежаванняў сталі абавязковым атрыбутам пандэміі каранавіруса ў многіх краінах свету, адзначыла daily.rbc.ua. Пратэсты перыядычна здараліся ў многіх еўрапейскіх дзяржавах, ЗША, Канадзе, Аргенціне, Аўстраліі, Індыі, Кеніі... Фактычна, пратэсная хваля ахапіла ўсе населеныя кантыненты. На акцыях супраць лакдаўну звычайна збіраецца вельмі пярэстая публіка. У першую чаргу, гэта тыя, хто непасрэдна пакутуе ад абмежаванняў: супрацоўнікі і ўладальнікі кафэ-рэстаранаў-гатэляў, іншых устаноў сферы паслуг, крамаў, турыстычных кампаній. Выходзяць на вуліцы і бацькі, збянтэжаныя закрыццём школ і дзіцячых садкоў.

Але сапраўднай раскошай антыкаранцінныя акцыі сталі для прыхільнікаў розных канспіралагічных тэорый. Дзякуючы пандэміі, абмежаванням і падвышанай увазе CMI да ўсяго, што звязана з каранавірусам, прыхільнікі розных маргінальных тэорый атрымалі выдатны шанц прыцягнуць да сябе беспрэцэдэнтную ўвагу, заўважыла daily.rbc.ua. Так, на некаторых еўрапейскіх пратэстах была заўважаная сімволіка прыхільнікаў QAnon. Як адзначаюць еўрапейскія медыя, тэорыя змовы пранікае і ў краіны ЕС, адаптоўваючыся да мясцовых рэалій.

У шэрагу краін ёсць і нацыянальныя асаблівасці антыкаранцінных пратэстаў. Напрыклад, у аўстралійскім штаце Вікторыя сярод удзельнікаў акцый заўважныя прыхільнікі тэорыі пра тое, што ўсё заканадаўства штата, прынятае з 1975 года, нелегітымнае, паколькі не было асабіста падпісана брытанскай каралевай Лізаветай II. Такім чынам, і каранцінныя абмежаванні выконваць ніхто не абавязаны. А ў Італіі ў датычнасці да радыкалізацыі пратэстаў паліцыя абвінаваціла злачынную групоўку Камора.

Але найбольш прыкметнымі на акцыях па ўсёй Еўропе з'яўляюцца прыхільнікі радыкальных палітычных поглядаў, у першую чаргу, ультраправых (хоць і леварадыкалы таксама шмат дзе адзначыліся). Вядома, менавіта яны, а не тыя ж афіцыянты, што засталіся без работы, устрывожаныя бацькі або працаўнікі вакцынацыі, звычайна стаяць за пераходам многіх пратэстаў у агрэсіўныя рэчышчы, аж да прамых сутыкненняў з паліцыяй. Таму менавіта радыкальныя групоўкі па выніках акцый атрымліваюць асноўную ўвагу з боку CMI.

З закрыццём межаў тэма барацьбы з мігрантамі, адна з ключавых для еўрапейскіх ультраправых, адышла далёка на другі план. Таму на сцяг яны ўзнялі ідэі барацьбы з каранцінныміабмежаваннямі, якія, на іх думку, бессэнсоўныя, шкодныя, несправядлівыя і антынародныя. Ультраправыя ўжываюць вельмі папулярную сярод радыкальных груп практыку «захопу» чужых акцый. Карыстаючыся палітычнай аморфнасцю і неарганізаванасцю большасці «звычайных» пратэстоўцаў, невялікая, але ідэйная і згуртаваная група можа хутка вылучыцца на першыя ролі ва ўсім руху.

Летам мінулага года ўрад Вялікабрытаніі выпусціў цэлую справаздачу, прысвечаную таму, як экстрэмісцкія групы любога кшталту выкарыстоўваюць пандэмію ў сваіх інтарэсах. Прычым гаворка ішла ў першую чаргу не пра вулічныя акцыі, а аб прапагандзе, у асноўным у інтэрнэце.

«Кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя наступствы пандэміі могуць стварыць спрыяльныя ўмовы для экстрэмізму. Экстрэмісты будуць спрабаваць капіталізаваць сацыяльна-эканамічныя наступствы COVID-19 для таго, каб у доўгай перспектыве правакаваць нестабільнасць, страх і падзел у Вялікабрытаніі», — адзначаецца ў справаздачы.

У дакументе згадваюцца і канкрэтныя прыклады таго, як пандэмію выкарыстоўваюць у ідэалагічных мэтах. Напрыклад, адна з брытанскіх неанацысцкіх груповак заклікала хворых на COVID-19 спецыяльна заражаць каранавірусам яўрэяў і мусульман. У сваю чаргу, радыкальныя ісламісты прасоўвалі тэзісы аб пандэміі як чароўным «пакаранні» для калектыўнага Захаду, паралельна сцвярджаючы, што за ўсім стаіць брытанская ўлада, якая хоча нашкодзіць мусульманскай меншасці.

Аўтары справаздачы канстатавалі: падчас пандэміі значна больш прыкметнымі сталі адэпты розных канспіралагічных тэорый, ад антывакцынатарскіх да антысеміцкіх. І нярэдка яны аб'ядноўваюцца на папулісцкай платформе супрацьстаяння палітычнаму істэблішменту і дзяржаве, якія нібыта выступаюць супраць інтарэсаў «простых людзей».

АД ХЕЛЬСІНКІ ДА ОКЛЕНДА

У Славакіі пакуль спрабуюць пазбегнуць татальнага лакдаўну, таму ўлады ўводзяць з 3 сакавіка каменданцкую гадзіну і з 15 сакавіка абавязковае нашэнне рэспіратараў. Не менш цяжкая сітуацыя зараз у Чэхіі. CNN назвала гэтую краіну «маленечкім астраўком гібелі і змроку на эпідэміялагічнай карце свету». Віной таму — новы штам COVID, які распаўсюдзіўся па ўсёй краіне і паставіў бальніцы на мяжу выжывання. З-за пагаршэння эпідэміялагічнай сітуацыі з 1 сакавіка ўрад на тры тыдні абмежаваў перамяшчэнне жыхароў межамі раёнаў іх пражывання. Забароненыя нават сустрэчы сваякоў, якія асобна пражываюць на тэрыторыі аднаго адміністрацыйнага раёна. Акрамя таго, з першага дня вясны ў краіне ў абавязковым парадку неабходна насіць рэспіратары ў грамадскіх месцах.

Тым часам для некаторых жыхароў Іспаніі прышчэпка становіцца абавязковай. Жыхароў аўтаномнай супольнасці Галісія, якія адмовіліся ад яе, паводле новага закона, абавяжуць заплаціць штраф у памеры да €60 тысяч. У Германіі каранцінны рэжым падоўжылі да 28 сакавіка. Аб гэтым паведаміла канцлер Ангела Меркель, перадала газета Zuddeutche Zeitung.

У Фінляндыі абвясцілі рэжым надзвычайнага становішча. У Францыі сітуацыя не лепшая. Прэм'ер-міністр краіны Жан Кастэкс заявіў на мінулым тыдні, што 20 дэпартаментаў у краіне знаходзяцца пад «узмоцненым назіраннем», і паколькі колькасць тых, хто захварэў на COVID, расце, там будуць уведзены абмежаванні. Нагадаем, па ўсёй краіне і так ужо дзейнічае агульнанацыянальная каменданцкая гадзіна з 18.00 да 6.00.

«Цяжка прадказаць, калі пандэмія пойдзе на спад у Еўропе. Я спадзяюся, што з павелічэннем ахопу вакцынаваных людзей, асабліва найбольш уразлівых, колькасць шпіталізаваных і колькасць смерцяў знізяцца. Магчыма, лета можа стаць паваротным момантам у пандэміі, — заявіў iz.ru эпідэміёлаг Інстытута фармакалагічных даследаванняў імя Марыё Нягрэй Антоніа Клавена.

Тым часам стала вядома, што ў найбуйнейшым горадзе Новай Зеландыі Оклендзе абвясцілі каранцін пасля пацверджанага выпадку заражэння каранавірусам. Для прадухілення распаўсюджвання COVID-19 закрыты ўезд і выезд з горада з насельніцтвам больш за 1,6 мільёна чалавек. Жыхарам нельга пакідаць свае дамы, за выключэннем паездак па прадукты, у аптэку ці на работу. На ўсёй астатняй тэрыторыі краіны ўводзіцца забарона на правядзенне масавых мерапрыемстваў.

Захар БУРАК.

«ЗАЧАРПНУ ВЕЦЕР У ДАЛОНІ», альбо Якой была рудая сініца?

Загадкі мастака Алега Прусава

«Не спрабуйце прымерыць да іх штодзённыя апранахі явы. Гэта мой свет, мая казка, мая прыдумка. І тое, што абыдзённа ў гэтым свеце, недапушчальна ў тым, створаным мной, і дзіўноты таго свету не вымярайце нормай звыклага нам».



Так калісьці тлумачыў мастак Алег Прусаў свае карціны...

У нашым сямейным альбоме, дзе ўжо тры дзясяткі гадоў распісваюцца госці, 15 лютага 1994 года з'явіўся запіс творчага саюзу «Убікус», які складаўся з двух таленавітых маладых віцебскіх мастакоў — Алега Прусава і Віктара Ласьмінскага. Яны прыйшлі пагаварыць пра лісты, вершы і малюнкі мастачкі, што вучылася з імі ў мастацкай вучэльні, у «Глебаўцы» — Ларысы Засімовіч, трагічны лёс якой узрушыў усіх знаёмых. Пасля першай персанальнай выставы Ларыса ў родным Слоніме спаліла свае карціны і самую сябе... Гэта здарылася за два гады да візіту віцебскіх мастакоў. Ларысе было дваццаць пяць. Алег і Віктар былі сярод тых, хто збіраў усё, што засталося ад няздзейсненага таленту, зладзілі выставу Ларысы...

Алег тады зрабіў вельмі яркае ўражанне на нас — сціплы, інтэлігентны і, гэта несумненна адчувалася, глыбокі чалавек. Было і адчуванне неверагоднай датклівасці. У нашым альбоме ён пакінуў у якасці аўтографа верш, які ў перакладзе на беларускую гучыць так:

«Зачарпну вецер у далоні.
Зачыню дзверы. Ля акна сяду.
Сцены — туманы белыя.
Гаспадыня ў доме — любоў.
Думкі — звяры невыносныя.
Разбегліся,
хто ж за вамі ўгоніцца?
Шоргат за вокнамі?
Гэта воблака,
Хвастом віляе,
Зайсці ў дом просіцца.»

І хто мог падумаць, што самому Алегу давядзецца пражыць усяго дваццаць шэсць, што праз два гады пасля нашага знаёмства, у верасні 1996-га, ён памрэ. Перад гэтым аслепне… Апошнія карціны напіша, зрабіўшыся практычна невідушчым. І таксама знойдзецца шмат тых, хто, ураженыя яркім талентам і трагічным сыходам, будуць збіраць спадчыну, асэнсоўваць, папулярызаваць...

Дарэчы, яшчэ пры жыцці Алег паспеў зведаць першую славу — на яго выставу ў Віцебску стаялі даўжэзныя чэргі, у Траццякоўскай галерэі ў 1991 годзе ён атрымаў прэмію за найлепшую работу года ў жанры жывапісу.

Сёння ў Нацыянальным мастацкім музеі працуе выстава Алега Прусава «Надпіс на адвароце. Жывапіс. Графіка. Паэзія».

«Спыняючы погляд, здзіўляючыся, любуючыся заходамі і ржавым цвіком, пераводжу тое, што запомнілася, у сімвалы, сваю азбуку. Іерогліфы складаюцца ў паняцці, маюць карціну майго светаадчування. Гэта мой шлях, я выбраў яго. Шчыльна нацягнутая ніць, дзве супрацьлегласці па баках... Гэта мой шлях, мая казка, мой спосаб выжыць».

Адзін з тых, дзякуючы каму да нас прыходзіць спадчына Алега Прусава, — яго пляменнік Станіслаў Прусаў. Разбіраючы рэчы ў кватэры Алега, сваякі знайшлі за сценкай каля дваццаці яго работ, і некалькі — Ларысы Засімовіч. Спадар Станіслаў знайшоў мяне, каб распытаць пра Ларысу. Бо збіраецца каталог работ Алега, і трэба высветліць усё, што магчыма, пра яго дзейнасць і творчасць.

«Кубак халоднай гарбаты».

Станіславу Прусаву было чатырнаццаць, калі дзядзька памёр. Ён расказаў, што ў сям'і ўсе пайшлі ў розныя прафесіі. Бацька — вайсковец, падпалкоўнік ВПС. Дзядуля — галоўны будаўнік Віцебскага ДБК, дзядзька — галоўны канструктар «Аўтаваза», Пётр Прусаў, вынайшаў пазадарожнік «Ніва». Сам спадар Станіслаў эканаміст-энергетык, кандыдат навук. Жартуе: «У мастацтве я грузчык — пераношу рэчы з аднаго месца на другое». Але насамрэч адчуваецца, што і ў мастацтве разбіраецца, і вельмі ўмела і аддана працуе дзеля папулярызацыі творчасці Алега Прусава.

— Пачалося ў 2017-м, калі мы зрабілі выставу Алега ў Лёзненскім музеі. Пасля па прапанове аднакласніка Алега, пісьменніка, у Віцебску прайшла выстава графікі і літаратурны вечар. З Віцебскім цэнтрам сучаснага мастацтва зрабілі выставу «Месяц Ай». Пасля з дапамогай сяброў, неабыякавых людзей адбыліся выставы ў Брэсце, Магілёве, Гомелі. У Гродне — сарвалася з-за пандэміі. І вось — Нацыянальны мастацкі музей... Работы збіралі і з нашай сямейнай калекцыі, і з віцебскага музея Шагала, нешта я выкупляў у людзей, нешта вярталі сябры. Прывезлі каля 150 работ, у экспазіцыйную прастору змясцілася каля сотні. Сайт памяці Алега існуе яшчэ з 2007 года — праект зрабіў у якасці дыпломнай работы мастак Аляксандр Карповіч. Выйшлі зборнікі вершаў Алега — першы, «Саната для флейты з марыяneткай», ён паспеў зрабіць сам, другі выпусцілі сябры пасля яго сыходу.

— Што ўкладалі ў назву выставы — «Надпіс на адвароце»?

—Гэта ад фотаздымка, які выкарыстаны ў якасці візітоўкі выставы. Алег пазіруе каля перавернутай карціны. Гэта дзесьці 1995 год, хутчэй за ўсё, калі яны з Віктарам Ласьмінскім адчынялі выставу ў Полацку «Сны з левага вока».

— Алег сапраўды пакідаў адчуванне чалавека, у якім куды больш, чым заўважна павярхоўнаму пагляду.

— Так, нягледзячы на свой узрост, пакідаў уражанне нешараговага чалавека, які валодае глыбокімі ведамі ў розных галінах. Памятаю радасныя моманты сустрэч з дзядзькам. Наша сям'я жыла ў Расіі, прыязджалі раз на год на месяц у Віцебск. Цікава, што ў майго бацькі з бацькам Алега розніца ў адзінаццаць гадоў, і Алег быў старэйшы за мяне на адзінаццаць гадоў. Забаўляліся па-хлапечы, бегалі... У апошнія гады сустракаліся часцей — тады ён ужо страціў зрок, але гэта ўжо іншае ўражанне, радасныя моманты здараліся раней... Звяртаючыся да творчасці Алега, увесь час нешта знаходзіш новае... Амаль заўсёды былі вершы, якімі суправаджаў карціны. Ёсць шмат работ, асабліва графічных, дзе вершы на адвароце. На сваіх ранніх работах часам змяшчаў знакі Задыяка — у залежнасці ад перыяду, у які пісаў.

— Вы ведаеце якія-небудзь гісторыі стварэння карцін, тое, што схавана ад мастацтвазнаўцаў?

— Вось цікавая серыя «П'яніцы», у якой Алег намаляваў сваіх сяброў, сярод якіх можна пазнаць вядомага скульптара, нашага знаёмага музыку... Я ведаю, адкуль на карціне, прысвечанай апошняму, маленькая чарачка і кубкі для гарбаты ў вачах. Ён калісьці быў тапёрам, іграў у рэстаране на акардэоне. У яго вельмі гнуткія пальцы, і гэтую характарыстыку Алег нават у дзвюх карцінах падкрэсліў. І чарачка ў героя на рабоце была зусім маленечкая, бо ён любіў піць гарбату, і калі іграў у рэстаране, думаў увесь час — ну вось закончым, вярнуся, пап'ю гарбаты. Таму ў вачах музыкі і з'явіліся кубачкі. Аднойчы на партрэце невядомай адна знаёмая Алега пазнала свае пантофлі. А вось як з'явілася карціна «Кароль блазнаў» 1989 года, якую для выставы мы забралі з Самары... У пакоі інтэрната, дзе жыў Алег, вісела выява з фільма «Вязень замка Іф», дзе ў ролі графа Монтэ-Крыста артыст Авілаў. У карціне пазнаецца алюзія на той вобраз. Часам сэнс мог растлумачыць толькі аўтар. Так, да карціны «Кат і ахвяра» — вобразаў... Але не паспеў іх увасобіць.

Выстава «Надпіс на адвароце» для многіх стала адкрыццём. Бо нават яе куратар, Кацярына Калянкевіч, да таго, як узялася за гэты праект, пра творчасць Прусава не ведала.

— Першае ўражанне было — я сутыкнулася з яркай індывідуальнасцю, вельмі самабытным мастаком, які не падобны ні да кога ў беларускім мастацтве... Мне падалося, што ён не ўпісваецца ў паняцце вядомай нам беларускай мастацкай школы. Заўважыла перагукванне з еўрапейскімі мастакамі. Жывучы ў эпоху постмадэрнізму, Алег не быў яго прыхільнікам у чыстым выглядзе, адчуваецца ўплыў мадэрнізму.

— Так, чула, як мастацтвазнаўцы параўноўвалі карціны Алега з французскімі і іспанскімі мадэрністамі... І паракалі, што не ведалі пра Прусава раней.

— У пачатку 1990-х Алег вельмі ярка заявіў пра сябе. У адной з перадач Віцебскага тэлебачання таго часу, запіс якой змешчаны на сайце памяці мастака, з вуснаў аднаго з наведвальнікаў яго выставы гучыць: «У нас ёсць Шагал, але ў нас ёсць і Алег Прусаў». Яго кар'ера была б сур'ёзнай, каб не ранні сыход. Сёння адбываецца вяртанне імя, якое стала часткай гісторыі беларускага мастацтва канца 1980-х — пачатку 1990-х. Гэта пацверджана фактам, што творы Алега Прусава трапяць у калекцыю Нацыянальнага мастацкага музея. Яны, як мне здаецца, вельмі зразумелыя гледачу, блізкія яму, паколькі вельмі эмацыянальныя, адначасова і загадкавыя, і зразумелыя.

— А як бы вы ахарактарызавалі гэтую эмацыянальнасць, якую афарбоўку яна мае? Ці адчуваеце прысутнасць хваравітасці, дэпрэсіўнасці?

— У творах Алега, нягледзячы на развагі пра няздзейсненае каханне, шмат эмацыянальнага прасвятлення... Ёсць нота драматызму і шмат светлай тугі. Мастак не апускаецца да беспрасветнай драмы, адчуваюцца іронія і самаіронія. У гэтым, напэўна, і прыцягальнасць — змешаная эма-

«Вялікія заваёўнікі».

цыянальная палітра, якая не дае адназначнага адказу.

— А якая ваша ўлюбёная карціна?

— У мяне іх некалькі... Вельмі падабаюцца «Дзень рудой сініцы» і «Пераможца настурцый». Мне блізкая гэтая вар'яцкая фантазія — «рудая сініца»… Адразу здзіўленне, як у маленькага дзіцяці — ці бывае такая, і якая яна? Бо на жывапісным палатне мы яе не бачым. Дзіўны, незразумелага ўзросту, персанаж стаіць з пустой клеткай. Мы адчуваем яго эмацыянальны стан. Герой выпусціў птушку, яму стала лягчэй... Але і шалёна адзінока. Паэтычная метафарычнасць твораў мяне скарае. У Алега ўвогуле шмат работ пра адзіноту. Гэта можа быць светлы стан, а можа быць вельмі сумны, ён можа быць перададзены проста праз філіжанку кавы... Не выпадкова сярод вобразаў Алега шмат мудрацоў. Думаю, ён дзесьці і адчуваў сябе такім мудрацом, ведаючы і разумеючы, што з ім адбываецца, ведаючы пра сваю хваробу.

Выстава працягнецца да 5 красавіка, не ўпусціце шанц далучыцца да дзіўнага і эмацыянальнага мастацтва Алега Прусава.

«Я і настольная лямпа чытаем адну кнігу. Схіліліся — галава да галавы, — я люблю з ёй чытаць адну кнігу. Лямпа чытае хутчэй, яна заўсёды чытае хутчэй, і пасля круціць галавой, зазірае пад стол, цягне шыю да акна. Высахла Чорнае мора. Кубак пусты. Астыла Чырвонае. Я чытаю кнігу. Лямпа чытае кнігу».

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.



«Месяц Ай».

«ТРЭБА ХВАЛЯВАЦЦА НЕ ЗА СЯБЕ, А ЗА ПЕРСАНАЖА»

З такой устаноўкай саліст оперы Вялікага тэатра Уладзімір ПЯТРОЎ выходзіць на сцэну

Сёлета Уладзімір Пятроў адзначыў адразу два юбілеі: у лютым народнаму артысту Беларусі споўнілася 60 гадоў. Акрамя гэтага, саліст оперы Вялікага тэатра адзначае і творчае свята — 30 гадоў на сцэне.
«Звязда» паразмаўляла з Уладзімірам Пятровым і даведалася аб поспехах, думках і хваляваннях артыста.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

— З нагоды вашага двайнога юбілею, ці акрэслілі вы некаторыя вынікі, звязаныя з вашай кар'ерай?

— Я не магу казаць, што я сеў і пачаў рабіць вынікі жніва. Гэта пастаянны працэс працы над спектаклямі, якія ідуць цяпер, жаданне зрабіць іх лепш. Я вам больш скажу: я ўвогуле не хацеў адзначаць гэтыя юбілеі. Але абставіны склаліся інакш. Тым больш, калі гэта спрацуе на тэатр, то чаму не?

Вынікі я падводжу ўвесь час. Ты адпрацаваў спектакль і, як правіла, пасля яго не спіш і аналізуеш, што атрымалася, а што не. Гэта ў любым выпадку псіхалагічная «напампоўка». Асабліва, калі гэта драматычна складаны спектакль.

— Калі вы ўжо закранулі гэтую тэму, апішыце свой стан перад спектаклем і пасля яго.

— Па-першае, налада голасу — гэтаму аддаецца львіная доля намаганняў. Па-другое, псіхалагічны стан. Трэба хвалявацца не за сябе, а за персанажа, ролю якога ты выконваеш. Карысна глядзець запіс спектакля неўзабаве пасля таго, як яго адпрацаваў. Параўнаць свае адчуванні з тым, што людзі бачылі збоку. Гэта таксама частка працы над роллю. Добра, калі на спектакль прыходзіць чалавек, вуху якога ты давяраеш. Мая жонка таксама музыкант, дзякуючы гэтаму можа падказаць, куды трэба ўнесці папраўкі. Такім чынам я выбудоўваю не толькі свой голас, але і паводзіны на сцэне.

— Каго вы лічыце майстрам у сваёй прафесіі?

— Я шмат сустрэў на жыццёвым шляху людзей, якія падказвалі, накіроўвалі. Гэта той багаж, які не цісне, але які ты набываеш, працуючы ў розных тэатрах з рознымі выканаўцамі, дырыжорамі, рэжысёрамі.

Што датычыцца вакалу, то гэта канешне ж барытоны: Батыстыні, Бастыяніні, Леа Нучы — мы разам пелі на фестывалі ў Швейцарыі. Тэнар Джузэпэ Джакаміні, уладальнік вельмі высокага і звонкага голасу. Таксама даводзілася сустракацца з ім на фестывалі. Адна справа слухаць выканаўцу ў запісах, а зусім іншая — ужывую. Канешне ж, гэтыя моманты незабыўныя. Вельмі шмат розных спевакоў, па якіх можна вастрыць свой інструмент. Гэта бясконцая праца, якая доўжыцца ўсё жыццё. У вакале ўсё будуецца на адчуваннях і параўнаннях. На дэталях, якія трэба заўважаць, разумець і аналізаваць. І такія сустрэчы з майстрамі даюць пэўную базу і настрой.

— Чаму ролю Рыгалета вы лічыце этапнай у сваёй кар'еры?

— Гэта вяршыня — вельмі складаная для барытона партыя. Акрамя таго, яна драматычная. А мой голас не зусім драматычны. У маладосці ў мяне быў лірычны барытон: я прыйшоў у тэатр і спяваў Анегіна, Ялецкага, Сільвіа. Прайшоў час, голас трошкі трансфармаваўся. Я захацеў паспрабаваць. І вось, нешта атрымалася. Каб навучыцца плаваць, трэба зайсці ў ваду. Я ў гэтых спектаклях зайшоў — і не шкадую.

— З гэтага вынікае лагічнае пытанне: якія этапы яшчэ не пройдзеныя?

— Іх вельмі шмат. Гэта і опера Джузэпэ Вердзі «Сіла лёсу», і моцная драматычная партыя Яга ў «Атэла». Нам не бракуе матэрыялу, маем справу з таленавітымі кампазітарамі і таленавітай музыкай.

— Якім чынам вы ўжываецеся ў ролю?

— Опера — гэта жывы жанр. Я вывучаю матэрыял, спрабую яго на свой голас. Чытаю літаратуру па спектаклі, гляджу відэа і параўноўваю, як гэта рабілі іншыя. Прыстасоўваю свой галасавы апарат да мізансцэн. Успамінаю законы сцэны Пакроўскага і Станіслаўскага. І нешта выкрышталізоўваецца. Мы ўсе быццам сасуды, у якіх вада ўвесь час пераліваецца. Адбываецца працэс узаемадзеяння, перадачы энергіі і ведаў ад аднаго чалавека да другога. Натуральна, гэта ўплывае і на спектакль. Тут вельмі важна, каб і рэжысёр, і дырыжор былі псіхолагамі, умелі сабраць каманду менавіта на гэты спектакль. Са мной працавалі падобным чынам, калі я выконваў ролю Анегіна ў кансерваторыі. Тады ўся драматургія, якая закладзена ў музыцы, робіцца больш зразумелай.

— У адным з інтэрв'ю вы казалі: «Свежасць шэдэўру трэба вяртаць, я бачыў, як разумна і далікатна гэта робяць у Францыі і Аўстрыі. Не любой цаной». Як вяртаць згаданую свежасць? І дзе менавіта для вас праходзіць мяжа паміж аднаўленнем і апошленнем?

— Тут вельмі тонкая грань. Я не прымаю, калі на сцэне робіцца бязладдзе. Мне спадабалася «Травіята» з Ганнай Нятрэбкай. Гэта сучасна, але там ёсць рэжысёрскае рашэнне, якое заснавана на тым, чаго патрабуе музыка. Такія пастаноўкі ты глядзіш на адным дыханні.

Толькі б гэта не супярэчыла музыцы — вось галоўны крытэрый. І яшчэ адказнасць. Часам у рэжысёраў яна адсутнічае. Яны жадаюць, каб запомнілі менавіта іх: вось усе зрабілі так, а я — наадварот, пастаўлю саліста на галаву. Пытанне: а гэта апраўдана? Зараз назіраецца рэжысёрскі разгул. Абавязкова трэба распрануць героя або гераіню. Часам нельга рабіць такія рэчы. Перш чым рашыцца на такое, трэба задаць сабе шэраг пытанняў. Напрыклад, што ты хочаш гэтым прамовіць? З іншага боку, колькі людзей, столькі і думак.

— Для вас як для гледача які від мастацтва любімы?

— Паколькі большую частку свайго творчага жыцця я правёў у класічным жанры, то цікаўлюся ў асноўным канцэртамі. Напрыклад, струннага квінтэта «Серэнада», мы з імі рабілі праграму неапалітанскіх песень, старадаўніх рускіх раманса, Чайкоўскага, Рахманінава. Але абавязковая ўмова — цікавая, душэўная музыка, якая кранае. Люблю ваенныя песні, на якіх я вучыўся спяваць. Мая маці прайшла вайну дзіцёнкам, таму тэма патрыятызму культывавалася ў сям'і. Зразумела, што зараз іншы час, іншае стаўленне да многага, але мне блізкія і савецкія песні. Тая ж «Радзіма» Серафіма Тулікава — выдатная мелодыя. Аляксандра Пахмутава, Яўген Пцічкін — гэта асобная плеяда музыкантаў. У свой час мяне захапіла і бардаўская песня: гітара, студэнцкія гады...

— Вашы словы: «Трэба, каб слухач быў падрыхтаваны, аб гэтым павінны клапаціцца дзяржава і грамадства». Што ўваходзіць у працэс падрыхтоўкі?

— Я не магу казаць, што я такі дасведчаны ў гэтай справе, педант, які можа даваць парады. Ніякім чынам. Але ясна, што неабходна папулярызацыя жанру класічнай музыкі, пошук новых формаў. Думаю, трэба пачынаць з сям'і і школы: заахвочваць у дзецях прагу да музыкі. Але калі ў школах адмяняюцца ўрокі музыкі, то што мы будзем выхоўваць? Каго мы будзем выхоўваць? Увогуле, я мару аб тым, каб культура стаяла на першым месцы. Перад палітыкай і эканомікай. Тады, напэўна, нешта зварухнецца. А да гэтага будуць адны толькі словы.

Арына КАРПОВІЧ.

Дзеля памяці

Іван з Беларусі

Такі надпіс пакінуў на сцяне рэйхстага беларускі пісьменнік Іван МУРАВЕЙКА

5 сакавіка закончылася зямное жыццё ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, ваеннага журналіста, дзіцячага пісьменніка Івана МУРАВЕЙКІ. Лічы, усе свае пасляваенныя гады (быў дэмабілізаваны ў 1947-м) ён пражыў у Любані, на Міншыне. Працаваў у рэдакцыі раённай газеты. І займаўся літаратурнай творчасцю.

Друкавацца Іван Муравейка пачаў яшчэ ў даваенны час. Першыя вершы выйшлі ў газеце «Піянер Беларусі». Такое цяжка і ўявіць — лічы, 85 гадоў творчай працы!.. А памёр пісьменнік на 100-м годзе жыцця (нарадзіўся ж 21 кастрычніка 1921 года ў вёсцы Таль Любанскага раёна).

У канцы 1939 года быў прызваны ў Чырвоную Армію. У Вялікую Айчынную ваяваў у складзе войскаў Заходняга, Данскога, 3-га Украінскага, 1-га Беларускага франтоў. Удзельнічаў у штурме Берліна. На сцяне рэйхстага пакінуў надпіс: «Іван з Беларусі». Дарэчы, так і адну са сваіх кніг назваў — «Я — Іван з Беларусі». У свой час яна выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда». І ўвогуле мы часта пісалі ў «Звяздзе» пра Івана Андрэевіча, да яго завітвалі і нашы фотакарэспандэнты. За баявыя здзяйсненні Іван Муравейка адзначаны двума ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі.

У 1953 годзе яго прынялі ў Саюз пісьменнікаў СССР. У 1964 годзе Іван Андрэевіч скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Адна за другой прыйшлі да чытачоў яго кнігі: «Песня над палямі», «Ручаінкі», «Вось якія мы», «Пра работу і ляноту», «Дружная сямейка», «Сем колераў вясёлкі», «Лясное возера», «Мы таксама падрасцём», «Растуць дзеці», «Як завуць казу?», «Вадзіца з крыніцы», «Я прыдумаў казку»... Пра сваю вайну Іван Андрэевіч расказаў у кнігах «Прынёс з вайны», «Была вайна», «Я — Іван з Беларусі»... У 1982 годзе пісьменніка і журналіста ўганаравалі званнем заслужанага работніка культуры БССР. Іван Муравейка ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

І зараз у адным з дзяржаўных кніжных выдавецтваў рыхтавалася да друку новая кніга дзіцячага пісьменніка. Яго, чалавека з багатай франтавой і жыццёвай біяграфіяй, любілі землякі (упэўнены, што і надалей будуць любіць і памятаць), любілі юныя чытачы нашай краіны. Ды і ў іншых старонках на розных мовах вершы Івана Муравейкі таксама прыходзілі да хлопчыкаў і дзяўчынак.

Кастусь ЛЕШНІЦА.

«ПАЎЛІНКА» ЗНОЎ НА СЦЭНЕ!

Купалаўскі адкрыў новы сезон

Паказ «Паўлінкі» стаў яго першай ластаўкай. У знакамітым спектаклі цяпер занятыя не толькі артысты тэатра, якія тут служаць не адзін год, але і іх маладыя калегі з Беларускай акадэміі мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

— Вы ведаеце, пасля прэм'еры мы ўсе плакалі, таму што паказ адбыўся і нас цёпла сустрэлі гледачы. Гэта было складана перажыць без эмоцый, бо я ўжо і не ўспомню, калі быў такі прыём. Спектакль паказалі, зрабілі гэта на высокім творчым узроўні, — дзеліцца **актрыса, народная артыстка Беларусі Зінаіда ЗУБКОВА.** — Паўлінка наша — яна студэнтка другога курса, але яна з голасам і настолькі абаяльная і простая, што арганічна ўпісалася ў нашу тэатральную атмасферу. І калі казаць пра нашу моладзь, якая зараз іграе ў спектаклі, то яны былі з запалам у вачах, і мы іх палюбілі з самага пачатку. Вядома, яны разумеюць, што выходзяць на галоўную сцэну краіны, і ім хочацца зрабіць усё на ўзроўні. Маладыя артысты прыслухоўваюцца да крытыкі і парад, бо маюць любоў да тэатра, і ім радасна, што яны цяпер яго частка. І гэта самае галоўнае, калі артыст разумее, што яго справа — быць на сцэне. І ў спектаклі яны чулі адно аднаго, рэагавалі, і дзякуючы гэтаму сапраўды паказалі атмасферу, закладзеную ў спектакль. Адназначна справіліся! Спадзяёмся, і надалей усё складзецца.

Нагадаем, што хоць упершыню «Паўлінка» была пастаўлена ў 1913 годзе, рэжысёрская версія, якая стала для тэатра класічнай, здзейснілася ў 1944 годзе ў Томску, дзе тэатр быў у эвакуацыі. «Паўлінку» тады паставіў заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Леў Літвінаў. А зараз у Купалаўскім тэатры адбылося (і яшчэ працягваецца) абнаўленне калектыву, мастацкім кіраўніком спектакля выступіла Вольга Няфёдава, якая іграе ў ім Альжбэту (маці Паўлінкі), у ролі рэжысёра сябе паказала студэнтка Акадэміі мастацтваў Зінаіда Вядзеніна. Маладой актрысе — студэнтцы ўніверсітэта культуры і мастацтваў — Анастасіі Варанковай дасталася галоўная роля Паўлінкі. Таксама тут задзейнічаны вядомыя ўжо даўно гледачу акцёры Генадзь Аўсяннікаў (Пранцысь Пустарэвіч), Тамара Міронава (Агата), Міхаіл Світа (пан Быкоўскі), Ала Ельяшэвіч (Адэля), Васіль Сушыцкі (Сцяпан Крыніцкі), Марыя Захарэвіч і Зінаіда Зубкова.

Спектакль «Паўлінка» — брэнд нацыянальнай культуры, і яго класічная пастаноўка ўжо даўно ўспрымаецца як візітная картка Купалаўскага тэатра. Тут раскрываецца народны характар і сацыяльны кантэкст, а сюжэт дэманструе шэраг важных тэм, у ліку якіх і канфлікт пакаленняў, у якім паказваецца імкненне да новага ладу жыцця. Адметнасцю гісторыі беларускага класіка з'яўляецца таксама яе нацыянальны каларыт, сакавіты гумар і дасканалая беларуская мова.

Паглядзець «Паўлінку» ў сакавіку гледачы маюць магчымасць яшчэ 6, 7, 14, 21, 25, 27 і 31 сакавіка. Білеты, як і раней, можна набыць у тэатральных касах альбо замовіць анлайн.

Алена ДРАПКО.
Фота з архіва Купалаўскага тэатра.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

31 марта 2021 года
СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»,
расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, д. 70 (конференц-зал)

Повестка дня собрания

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» за 2020 год. Утверждение ключевых показателей эффективности на 2021 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» о проделанной работе в 2020 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», распределение прибыли и убытков ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» за 2020 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» за 2020 год.
5. Об утверждении направлений распределения и использования чистой прибыли (убытков) за 2020 год. О выплате дивидендов за 2020 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» на 2021 год.
7. Об избрании членов Наблюдательного совета ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», его составе и ревизионной комиссии ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».
8. Утверждение размера вознаграждения членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало работы собрания в 12.00.
Регистрация участников собрания с 11.30 до 11.50.

Наблюдательный совет
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».
УНП 500021638

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Продавец: открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР», 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81, тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

